

Атрымаць матэрыяльную кампенсацыю за паездку дамоў да бацькоў іншагародні студэнты і навучэнцы змогуць цяпер нават у тым выпадку, калі яны выправіліся ў дарогу ў пятніцу, а вярнуліся на заняткі ў панядзелак. СТАР. 5



Нервовая анарэксія, нервовая булімія і пераяданне. Чаму ўзнікаюць гэтыя праблемы і як іх перамагчы? На пытанні карэспандэнтаў, а таксама слухачоў і чытачоў адказвае ўрач-псіхатэрапеўт. СТАР. 5



Пара здымаць галаўныя ўборы, гэта значыць, трэба наведаць цырульню. У які дзень лепш гэта зрабіць, вам падкажа гараскоп стрыжак на красавік. СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 КРАСАВІКА 2012 г. СЕРАДА № 65 (27180) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## У Беларусі рабочы дзень з панядзелка 23 красавіка пераносіцца на суботу 28 красавіка

**Такое рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў ад 2 красавіка 2012 года № 294, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага ўрада.**

Арганізацыям прадастаўлена права з улікам спецыфікі вытворчасці (работы) ажыццяўляць перанос рабочага дня ў іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

## БЕЛАРУСЬ ПАЦВЯРДЖАЕ НАМЕР РАЗВІВАЦЬ ЯДЗЕРНУЮ ЭНЕРГЕТЫКУ Ў ЦЕСНЫМ УЗАЕМАДЗЕЯННІ З МАГАТЭ

**Беларусь пацвярджае намер развіваць ядзерную энергетыку ў цесным узаемадзеянні з МАГАТЭ. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора на сустрэчы з генеральным дырэктарам Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) Юкія Амана, перадае БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што свет перажывае асаблівы перыяд у развіцці мірнага атама пасля вядомых падзей у Японіі і праблем з ядзернай электрастанцыяй «Фукусіма», узнікшых пасля гэтай катастрофы рэакцыі і намераў Германіі і іншых краін згарнуць ядзерныя праекты. «У гэты асаблівы перыяд мы цвёрда і адназначна заяўляем аб тым, што мы не проста маем намер пабудаваць атамную электрастанцыю, але і пачалі яе будаўніцтва», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Я лічу, што МАГАТЭ — арганізацыя, вельмі зацікаўленая ў тым, каб такія, вядома ж, бяспечныя праекты ў свеце рэалізоўваліся. Таму мы вельмі спадзяёмся, што пан Амана, як і папярэднія кіраўнікі гэтага агенцтва, акажа нам сур'ёзную маральную падтрымку ў будаўніцтве атамнай электрастанцыі», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што будаўніцтва АЭС праходзіць у краіне, якая найбольш сур'ёзна пацярпела ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. «І тое, што сёння насельніцтва — нам гэта ўдалося зрабіць — падтрымлівае гэты праект, вельмі сімптаматычна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён цвёрда перакананы, што ядзерная энергетыка — гэта найбольш бяспечны шлях атрымання таннай энергіі. «Я цвёрда перакананы, што ядзернай энергетыцы быць і што гэта найбольш бяспечная сфера і найбольш бяспечны шлях атрымання таннай энергіі, у якой свет будзе мець усё большую патрэбу», — сказаў ён.

Звяртаючыся да Юкія Амана, Прэзідэнт выказаў надзею, што, пазнаёміўшыся з Беларуссю і ўбачыўшы ўсё на ўласныя вочы, ён зробіць для сябе пэўныя вывады аб тым, як працаваць з Беларуссю і ў якім напрамку.

«Калі будзе ваша садзейнічанне, падтрымка і адпаведныя ўмовы, мы гатовы і другую атамную станцыю пабудаваць у Беларусі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу госць падкрэсліў, што Беларусь з'яўляецца вельмі важным партнёрам для МАГАТЭ, паколькі ў краіны ёсць свой сумны вопыт у сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС. Ён адзначыў, што аварыя на «Фукусіме» сур'ёзна падарвала давер людзей да атамнай энергетыкі. Некаторыя краіны, такія як, напрыклад, Германія, вырашылі ўстрымацца ад выкарыстання ў далейшым атамнай энергіі, але некаторыя дзяржавы прынялі рашэнне яе развіваць. «Кожная краіна мае патрэбу ў развіцці энергетыкі, паляпшэнні жыцця свайго насельніцтва, і ў сувязі з гэтым з'яўляецца важным рашэнне аб выкарыстанні атамнай энергіі», — лічыць гендырэктар МАГАТЭ.

## Міхаіл Мясніковіч запатрабаваў узмацніць кантроль за навядзеннем парадку на зямлі

**Адпаведнае патрабаванне ён агучыў учора на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна, дзе разглядаўся ход выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы і ўрада аб навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні тэрыторыі населеных пунктаў у гэтым годзе, перадае БЕЛТА.**

«Трэба шчыра сказаць, што не ўсе населеныя пункты знаходзяцца ў належным стане. Гэта датычыцца і нашых аўтамабільных трас, усё, што звязана з прыдарожнымі палосамі і палосамі адчужэння чыгункі, — канстатаваў кіраўнік урада. — У вельмі дрэнным стане знаходзяцца аўтазапраўкі». Міхаіл Мясніковіч даручыў актывізаваць работу па навядзенні парадку на зямлі. «Наперадзе рэлігійныя святы, і гэтаму трэба ўдзяліць асаблівую ўвагу, прывесці ў парадак могілкі», — дадаў ён. Прэм'ер-міністр папрасіў таксама звярнуць увагу на пытанні ліквідацыі несанкцыянаваных звалак, як бытавых, так і будаўнічых.

На пасяджэнні Прэзідыума Саўміна быў разгледжаны таксама праект канцэпцыі закона аб электраэнергетыцы. Прэм'ер-міністр звярнуў асаблівую ўвагу, што пры падрыхтоўцы канцэпцыі неабходна ў абавязковым парадку ўлічваць неабходнасць павышэння энергабяспекі Беларусі. «Размова ідзе аб нарматыўна-прававым акце, які павінен устанавіць пэўныя эканамічныя і грамадскія адносіны ў краіне з улікам рашэнняў, прынятых у рамках АЭП», — сказаў ён. Павінна быць гарантавана поўнае і якаснае забеспячэнне галін эканомікі і насельніцтва электраэнергіяй.



## У кожнага — свая кніга

Фота БЕЛТА

ДЗІЦЯЧАЯ бібліятэка № 9 у Чыжоўцы адчыніла дзверы пасля капітальнага рамонту. Упершыню бібліятэка адкрылася ў маі 1979 года. За актыўную работу з падрастаючым пакаленнем калектыў адзначаны ганаровай граматай упраўлення культуры Мінгарвыканкама. На пачатак гэтага года фонд бібліятэкі склаў 58 018 выданняў. Чакаецца 150—200 наведванняў у дзень. Бібліятэка ажыццяўляе і шэраг платных паслуг: выдача на дом літаратуры з закрытага фонду чытальнай залы, раздрукоўка на каляровым прынтары, запіс дакументаў на электронныя носьбіты, паслугі сканіравання і інш. Для карыстання чытачоў прадастаўляецца высакаскорасны безлімітны Internet.



Самы прывабны аддзел для сучаснага маладога чытача — медыятэка — працуе з электроннымі выданнямі.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Людміла ЦЯГЛОВА, намеснік старшыні канцэрна «Беллегпрам»:**

***«Увогуле, прыватызацыі мы не баімся. Іншая размова, каб прыватызацыя не стала «прыхватызацыяй». Асноўныя ўмовы пры продажы дзяржаўнага пакета акцый — захаванне профілю прадпрыемства і працоўных месцаў. У лёгкую прамысловасць укладзена дастаткова шмат дзяржаўных сродкаў. Аддаваць прадпрыемствы ў чужыя рукі нам шкада, але ўсё павінна быць рацыянальна і эфектыўна».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 04.04.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8120,00 | ▲ |
| Еўра | 10830,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 277,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1010,77 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 16° |
| Віцебск | + 3° |
| Гомель | + 12° |
| Гродна | + 6° |
| Магілёў | + 3° |
| Мінск | + 3° |

■ Рынак працы

# ПА РАЗЛІКУ ЦІ ПА ЛЮБОВІ?

**На рынку працы Магілёва, як і па ўсёй Беларусі, патрабуюцца будаўнікі. Апошнія тэндэнцыі давядзецца ўлічыць маладым людзям, якія выбіраюць будучую прафесію.**

### Вясне — дарогу

У абласным цэнтры чакаюць веснавога ажыўлення на рынку працы, але сутнасць застаецца ранейшай: будаўнічыя прафесіі з'яўляюцца самымі запатрабаванымі. Муляры і тынкоўшчыкі — каралі дэфіцыту. Гэта сучасная працоўная аксіёма, хоць зарабіць на сезонным уздыме можна ўсім, бо прапановы датычацца не толькі будаўніцтва, якое цяпер ажыўляецца, але і добраўпарадкавання, азелянення, прыбірання тэрыторый.

Работнікі на лета патрэбны і некаторым прадпрыемствам: напрыклад, фабрыцы марожанага, дзе збыт прадукцыі і, адпаведна, аб'ёмы вытворчасці залежаць ад павышэння тэмпературы паветра. Нялішнімі будуць працоўныя рукі гараджан і ў сельскіх гаспадарках, якія якраз распачынаюць пасяўныя кампаніі.

— З іншага боку, пры павелічэнні колькасці вакансій увесну забяспечыць іх бывае дастаткова складана, — зазначае **начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Магілёўскага гарвыканкама Віталь КІРЭЕЎ.** — Таму што назіраецца сезонны выезд рабочых за мяжу: у Расіі таксама актывізуецца будоўля. Сёння сітуацыя на рынку працы ў Магілёве так: афіцыйна зарэгістравана 1850 беспрацоўных, ёсць 2300 вакансій.

### Эксперт будаўнікоў

Цяпер афіцыйны ўзровень беспрацоўя вельмі нізкі, меней за 1 працэнт. Статыстыкі цяпер робяць даследаванне паводле міжнародных узораў, якое дапаможа даведацца пра рэальныя маштабы беспрацоўя. Сёння, паводле некаторых ацэнак, яны могуць даходзіць да 5%.

— Але ці варта лічыць беспрацоўным грамадзяніна, які ездзіць працаваць у Расію? — запрашае паразважаць Віталь Сцяпанавіч. — Лічыцца, што гэта не вельмі добра, калі чалавек з'язджае з дому ў пошуках большага заробку. Але ўрэшце ён прывозіць свае грошы сюды, і тут яны трапляюць у абарачэнне. З іншага боку, ён не плаціць тут падаткі і не робіць адлічэнні ў пенсійны фонд, і гэта дрэнна для дзяржавы. Але і сам чалавек мае праблемы: яму не залічваецца стаж і пенсія ўрэшце будзе малая. Таму вельмі важна, каб нашы службы выходзілі на расійскі рынак і забяспечвалі нашых рабочых у Расіі сацыяльным пакетам.

Рэальная заработная плата ў Магілёве за люты крыху перавысіла 2,9 мільёна рублёў. Сёння заробкі на вакансіях, якія прапануе служба занятасці Магілёва, складаюць ад мільёна да чатырох. Тры мільёны рублёў — сярэдні ўзровень, які хочуць сёння атрымліваць людзі, але мараць ужо і пра большае.

— У Расіі стандартам лічыцца заработная плата 40-45 тысяч рублёў, або прыкладна 1,5 тысячы долараў, — расказвае кіраўнік гарадскога упраўлення па працы і занятасці. — Трэба ўлічваць, што як мінімум 10-15 тысяч рублёў з іх трэба будзе выдаткаваць на штодзённае жыццё, кватэру і прадукты. Але тысячу долараў нашы будаўнікі зарабіць за мяжой могуць. Хаця многія, калі ўлічваюць праблемы адзінокага жыцця, нелегальнай працы і малой пенсіі ў будучыні, гатовы былі б за 500 долараў працаваць дома.

### Усе ў гіпермаркет

Праблема нелегальнай працы датычыцца не толькі будаўнікоў: без афармлення часта працуюць прадаўцы ў прыватным гандлі і рамонтнікі ў аўтагаражах. Добры даход цэняць маладыя людзі, якім яшчэ далёка да пенсійнага ўзросту. Людзі сярэдняга ўзросту ўжо задумваюцца, што рэальны, але ўсё ж нелегальны заробак не забяспечыць добрай пенсіі.

«Схаванае беспрацоўе» ствараюць інжынеры-праграмісты альбо, як звычайна кажуць, камп'ютаршчыкі. Маладыя людзі з такімі навыкамі вельмі часта аддаюць перавагу высокім заробкам у замежных фірмах: інтэрнэт працуе ўсюды.

Рынак працы таксама залежыць ад сітуацыі на дзейных прамысловых прадпрыемствах. Напрыклад, на заводзе штучнага валакна ў Магілёве чакаецца на працягу паўгода вызваленне 719 работнікаў, з якіх больш за 500 ужо не працуюць.

— Частцы людзей знойдзецца праца на «Магілёўхімвалакне», частка ўладкуецца на іншых вытворчасцях, але многім давядзецца перавучвацца, — каментуюць у службе занятасці. СТАР. 2

■ Выставы

## АЙЧЫННЫЯ ВАЛЁНКІ, РАСІЙСКІ ШАЛЬ — І БЕЛАРУСКА ПЕРАСЯГНЕ ПА ШАРМЕ ЛЮБУЮ ФРАНЦУЖАНКУ

**А аб прыгажосці нашых жанчын і гаварыць не даводзіцца!** СТАР. 2



Паўлавапасадскія шалі будуць пасаваць беларускам, упэўнены прадстаўнік расійскага прадпрыемства.



Навінка-ўзор ад Смілавіцкай валюшна-лямцавай фабрыкі: валёнкі з натуральным футрам.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БРЫТАНІЯ І АРГЕНЦІНА АДЗНАЧАЮЦЬ 30-ГОДДЗЕ ФОЛКЛЕНДСКАЙ ВАЙНЫ НОВЫМ АБВАСТРЭННЕМ

Жалобныя цырымоніі праходзяць на фоне новага абвастрэння. Яго прычынай стаў фінансавы крызіс, які прымусіў брытанцаў скарачаць выдаткі на ваенна-марскі флот, і іх жа спробы распрацоўваць нафтавыя радовішчы на спрэчных тэрыторыях. У выніку бакі абвінавацілі адзін аднаго ў каланіялізме. А спрэчка з-за астравоў дасягнула найвышэйшага за мінулыя 30 гадоў напалу.

### УКРАІНА ЗНОЎ ЗАПЛАЦІЦЬ КАМПЕНСАЦЫІ ЎКЛАДЧЫКАМ АШЧАДНАГА БАНКА СССР

Украінскі дзяржаўны «Ощадный банк» да канца года разлічвае выплаціць 6 млрд грыўняў (746,6 млн долараў) кампенсацый па абясцэненых укладах у былым Ашчадбанку СССР. Грошы будуць залічвацца на спецыяльную картку. Кампенсацыі пачнуць выплачвацца, як толькі будзе абноўлена база звестак кліентаў. Цяпер грошы выплацяць тым, хто не атрымаў кампенсацыю ў 2008 годзе, калі каля шасці мільёнаў чалавек атрымалі па 1000 грыўняў. Цяпер яшчэ каля шасці мільёнаў украінцаў, якія мелі ў мінулым рахункі ў Ашчадбанку СССР, павінны атрымаць таксама па 1000 грыўняў. Абнаўленне базы звестак пачнуць з укладчыкаў, якім на 1 студзеня 2012 года споўнілася 80 і больш гадоў, а праверка звестак укладчыкаў, маладзейшых за 50 гадоў, пачнецца ў канцы ліпеня. Самі выплаты, як разлічваюць у «Ощадбанке», павінны пачацца ў чэрвені.

### КРАІНЫ ЗАХОДНЯЙ АФРЫКІ ЎВЯЛІ ЭКАНАМІЧНЫЯ САНКЦЫІ СУПРАЦЬ МАЛІ



Заходнеафрыканскія краіны ўвялі санкцыі супраць Малі, запатрабаваўшы ад ваеннай хунты, якая захапіла ўладу, вярнуць канстытуцыйны лад. Яны спынілі гандаль з Малі і закрылі доступ краіны да рахунку ў рэгіянальным Цэнтрабанку. Акрамя таго, супольнасць краін Заходняй Афрыкі прывяла ў баявую гатоўнасць свае ваенныя сілы.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### КРАІНЫ МЫТНАГА САЮЗА БУДУЦЬ РАСЦІ ХУТЧЭЙ ЗА СУСВЕТНУЮ ЭКАНОМІКУ



**Мінэканамразвіцця РФ прагназуе апераджальны рост эканомік краін Мытнага саюза да 2030 года ў параўнанні з сусветнай эканомікай.**

«Краіны, з якімі мы аб'ядноўваемся (з Беларуссю і Казахстанам), маюць доўгатэрміновы патэнцыял росту, які перавышае патэнцыял росту ў сусветнай эканоміцы», — сказала міністр эканамічнага развіцця РФ Эльвіра Набіуліна на навуковай канферэнцыі па праблемах развіцця эканомікі і грамадства.

«У цэлым мы чакаем, што ў перыяд да 2030 года рост сусветнай эканомікі ў сярэднім складзе 3,3% за год», — сказала яна, дадаўшы, што таксама чакаецца падзенне тэмпаў росту ў Індыі і Кітаі да 4-5%. Аднак гэта будзе істотна апярэджваць рост у развітых краінах, дзе з улікам назапашаных праблем ён не перавысіць 1-1,5% за год на перыяд да 2030 года.

«У гэтых умовах Беларусь і Казахстан змогуць павялічыць аб'ём эканомікі на 4-4,5%, а інтэграцыйныя працэсы, аб'яднанне рынкаў дазволяць істотна павысіць эканоміку ўсяго рэгіёна», — сказала яна.

КОРАТКА

У Беларусі памер дапамогі па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў упершыню будзе ўвязаны з сярэдняй заработнай платай па краіне. Аб гэтым учора журналістам паведаміла начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Вера Лабковіч. «Прадугледжваецца змяненне механізму разліку дапамогі па догляду дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў: памер дапамогі будзе ўвязаны з сярэдняй заработнай платай па краіне і дыферэнцыраваны ў залежнасці ад чарговасці нараджэння дзяцей», — сказала Вера Лабковіч.

Кошт праезду ў грамадскім транспарце Мінска даражэе з 5 красавіка з Br1,3 тыс. да Br1,5 тыс. за адну паездку. Пры рэалізацыі білетаў на адну паездку вадзіцелямі ў аўтобусах звычайных і скорасных маршрутаў у рэгулярных зносінах, трамваях, тралейбусах кошт білета павялічваецца на Br200 да ўстаноўленага тарыфу. Рашэннем Мінгарвыканкама ўстаноўлены кошт праязных білетаў. Так, на адзін від транспарту кошт праязнога на месяц складзе Br61,6 тыс., на дэкаду — Br21,6 тыс., на два віды транспарту — адпаведна Br82,4 тыс. і Br28,9 тыс., на 4 віды транспарту — адпаведна Br111,1 тыс. і Br39 тыс.

# ШТО ДАЕ НАМ ВЕДАННЕ ГІСТОРЫІ?

*Сёння дзень народзінаў Льва Сапегі, аднаго з аўтараў Статута ВКЛ 1588 года, які стаў падмуркам для стварэння канстытуцый многіх еўрапейскіх краін*



**Адам МАЛЬДЗІС, доктар філалагічных навук, Мінск:**

— Веданне гісторыі дае нам веданне жыцця нашых папярэднікаў. Не толькі інтэлігенцыі або працоўных, але і прадстаўнікоў улады. Сярод тых магнатаў, якія жылі на тэрыторыі Беларусі, для нашай краіны найбольш зрабілі Сапегі. У свой час Леў Сапега быў асноўным дзяржаўным дзеячам, дэмакратычным, прадпрымальным. Статут ВКЛ 1588 года, адным з аўтараў якога ён быў, — гэта фактычна збор законаў. Тады ён разглядаўся як канстытуцыя. Значыць, мы займелі канстытуцыю раней, чым французы. Вельмі добра, што сапегаўскі Ружанскі палац зараз аднаўляецца. Некалі там былі неймаверныя мастацкія каштоўнасці! Але пасля паўстання 1832 года ў час вайны яны былі вывезены ў Пецярбург. Сапегі — беларускі праваслаўны род. Нашчадкі Сапегаў жывуць па ўсім свеце і зараз. Некалі на тапанімічнай камісіі Мінгарвыканкама я ставіў пытанне аб тым, каб назваць адну з вуліц Мінска імем Льва Сапегі.



**Сяргей РУБЛЕЎСКІ, начальнік аддзела па архівах і справаводстве Віцебскага аблвыканкама, Віцебск:**

— Веданне гісторыі дае нам магчымасць глядзець на сучаснасць як праз павелічальнае шкло, узбагачае асацыяцыямі. Не трэба забываць, што гістарычныя звесткі прыпраўлены выдаткамі сацыяльнай практыкі. Бадай, кожнае грамадства мае прывычку ідэалізаваць будучыню і міфалагізаваць мінулае. Ідэалізацыяй будучыні быў, напрыклад, абвешчаны намер пабудаваць рай на зямлі, які назвалі камунізмам. Калі гаварыць пра Льва Сапегу, мне падабаецца яго памкненне адстойваць суверэнітэт ВКЛ. Сапега выступаў супраць гвалтоўнага пераводу жыхароў княства ва ўніяцтва і з гэтай прычыны ўступаў у вострую палеміку з Язафатам Кунцэвічам. Ён імкнуўся да згоды ў грамадстве і ўмацоўваў верхавенства права. Не прымаю яго пераходы з аднаго веравызнання ў другое. Як на мой розум, дык звяртацца да Бога трэба той малітвай, якую шаптала каля твайго вуха маці.

**Падрыхтавала Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

# НА САЦЫЯЛЬНУЮ ПАДТРЫМКУ АДОРАНЫХ НАВУЧЭНЦАЎ І СТУДЭНТАЎ У 2012 ГОДЗЕ ВЫДЗЕЛЕНА BR3,8 МЛРД

**На фінансаванне расходаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў у 2012 годзе з рэспубліканскага бюджэту за кошт сродкаў рэзервовага фонду кіраўніка дзяржавы выдзелена Br3 838 945 тыс. Аляксандр Лукашэнка 30 сакавіка падпісаў адпаведнае распараджэнне, якім таксама зацверджана рашэнне савета спецфонду, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Сродкі будуць накіраваны на выплату стыпендый студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі, заахвочванне пераможцаў рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, канферэнцый, конкурсаў і турніраў навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, аказанне матэрыяльнай дапамогі адораным навучэнцам і студэнтам. Акрамя таго, за кошт гэтых сродкаў будзе аказана фінансавая падтрымка вучнёўскім і студэнцкім навуковым і творчым аб'яднанням, заахвочаны вучоныя і выкладчыкі за высокія дасягненні ў развіцці здольнасцяў адоранай моладзі.

Рашэннем савета фонду заахвочаны 261 пераможца і прызёр інтэлектуальных спаборніцтваў і аказана матэрыяльная падтрымка 7 навукова-даследчым, навуковым і творчым аб'яднанням навучэнцаў і студэнтаў.

Грашовымі прэміямі ў памеры ад Br1575 тыс. да Br1925 тыс. з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду заахвочаны 15 пераможцаў Міжнароднай студэнцкай алімпіяды ў галіне інфарматыкі і праграмавання.

Прэміямі ў памеры ад Br140 тыс. да Br245 тыс. узнагароджаны 43 пераможцы алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычная і духоўная агульнасць», 150 пераможцаў рэспубліканскіх конкурсаў даследчых работ навучэнцаў па беларускай мове і літаратуры, гісторыі, грамадазнаўстве, рускай мове і літаратуры, англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай мовах, геаграфіі і 33 пераможцы XIII Рэспубліканскага турніру юных матэматыкаў.

18 пераможцаў XII Усерасійскай каманднай алімпіяды школьнікаў па інфарматыцы і праграмаванню і 2 пераможцы адкрытага чэмпіянату па цырульніцкім майстэрстве, нейл-дызайну і дэкаратыўнай касметыцы на Кубак Расіі «Неўскія берагі» адзначаны прэміямі фонду ў памеры Br700 тыс. кожная.

Фінансавую падтрымку ў памеры Br524 580 тыс. атрымаюць студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, Бабруйскага філіяла Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, а таксама навуковае таварыства ліцэістаў Рэчыцкага дзяржаўнага раённага ліцэя, навукова-творчае студэнцкае бюро і ваенна-навуковае таварыства курсантаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Як адзначылі ў прэс-службе, прыняцце распараджэння Прэзідэнта накіравана на забеспячэнне адраснай дзяржаўнай падтрымкі адораных навучэнцаў і студэнтаў.

# ПА РАЗЛІКУ ЦІ ПА ЛЮБОВІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аднак разам з тым у абласным цэнтры і прыгарадзе ствараюцца новыя прадпрыемствы, дзе адкрываюцца новыя працоўныя месцы. Напрыклад, «ВМГ Індустры», дзе ўжо сёлета мяркуецца пачаць выраб пліты з драўніны, а таксама мэблі, у перспектыве спатрэбіцца каля 1000 рабочых. Таксама ў Магілёве ўзводзяцца вялікія гандлёвыя комплексы і гіпермаркеты, дзе патрабуецца шмат работнікаў.

— Цяпер адбываецца пераразмеркаванне рабочай сілы з рэальнага сектара эканомікі ў сферу гандлю, — гаворыць пра сучасную тэндэнцыю Віталь Кірэеў. — Сёння ў горадзе вялікі попыт на прадаўцоў.

## Эканамісты пад сумненнем

Яшчэ з дзясятак гадоў таму маладыя людзі скрозь ішлі вучыцца на юрыстаў і эканамістаў. Нельга сказаць, што сёння юрысты не патрэбны. Патрэбны, але менавіта добрыя: з вопытам альбо з выдатнымі ведамі, паказчыкам якіх з'яўляецца дыплом вядомай навучальнай установы.

А вось з вельмі папулярнымі яшчэ нядаўна эканамістамі сапраўды праблема. У Магілёве жартуюць, што ўсе навучальныя ўстановы, акрамя, бадай што, кансерваторыі, рыхтуюць эканамістаў. Ім цяпер раяць альбо павышаць адукацыю, каб вылучыцца з агульнай масы прэтэндэнтаў на працоўныя месцы, альбо перавучвацца на бухгалтараў, якія больш запатрабаваны.

Настаўнікам, якіх у Магілёве шмат дзякуючы мясцоваму ўніверсітэту, таксама практычна не ўладкавацца: сёлета былі толькі вакансіі выкладчыкаў англійскай мовы. З усіх педагогаў працу магчыма знайсці толькі для выхавацеля дзіцячага садка. Таму маладым настаўнікам трэба цаніць сваё першае месца, атрыманае падчас дзяржаўнага размеркавання.

Навучальныя ўстановы прапануюць і новыя, актуальныя, спецыяльнасці: напрыклад, цяпер у Беларуска-Расійскім універсітэце можна атрымаць прафесію праграмнага інжынера (звязаную з кіраваннем штучным інтэлектам). У Магілёўскім політэхнічным каледжы, як і заўсёды, чакаецца вялізны конкурс тых, хто хоча авалодаць праграмным забеспячэннем інфармацыйных тэхналогій. Але ўсё ж маладым людзям трэба рабіць свой прафесійны выбар толькі пасля вывучэння сітуацыі на рынку працы, каб потым не было расчаравання.

## Рэальныя зваршчыкі

Акрамя будаўнікоў, у абласным цэнтры заўсёды ёсць попыт на станочнікаў, токараў і фрэзероўшчыкаў.

— У Магілёве вельмі запатрабаваны зваршчыкі, — звяртае ўвагу Віталь Кірэеў. — Так здарылася, што ў нас шмат машынабудаўнічых прадпрыемстваў, а там усё працуе на зварачнай вытворчасці. Заробак зваршчыкаў, якія маюць высокія кваліфікацыю і прадукцыйнасць працы, — 5-6 мільёнаў рублёў.

Увогуле, кваліфікацыя — гэта ключавая рэч. Трэба адзначыць, што і будаўнік «з вуліцы» наўрад ці будзе сёння запатрабаваным. Нават калі наймаюць людзей для выканання прыватнага заказу — напрыклад, рамантаваць кватэру — у іх абавязкова пытаюцца пра адукацыю, вопыт і нават рэкамендацыі.

У абласным цэнтры на добрае працоўнае месца могуць разлічваць урачы і медсёстры. Апошнім часам стала прасцей знайсці працу швачкам, таму што адкрыўся шэраг новых прадпрыемстваў, а на фабрыцы «Вяснянка» адбылася мадэрнізацыя.

— Праўда, сучасныя жанчыны ўжо не вельмі хочуць працаваць на канвеерах, — кажуць у службе занятасці. — Як і на Захадзе, нашым жанчынам не падабаецца аднастайная праца высокай інтэнсіўнасці. Напрыклад, работніцам, якія раней працавалі на заводзе абмотчыцамі і былі скарочаны, прапанавалі пайсці на такую ж працу на іншым прадпрыемстве, толькі канвеерную. Не ўсе захацелі, многія перавучваліся.

Увогуле ёсць меркаванне, што ў XXI стагоддзі захаваць аднойчы выбраную прафесію да старасці ўжо немагчыма: свет, людзі і іх патрэбы мяняюцца імкліва. Таму перакваліфікацыя павінна стаць звыклай справай, і не трэба пужацца кардынальных змен у сваім працоўным жыцці.

Ужо цяпер тыя ж швачкі і абмотчыцы даволі ахвотна перавучваюцца, напрыклад, на кранаўшчыц: гэта цікавей за звыклы канвеер, і заробак вышэй.

## Спецыяліст у любімай справе

Моладзь лічыць, што цяпер модна быць бізнэсменамі (і па магчымасці, адразу паспяховымі), банкаўскімі работнікамі, піяр-менеджарамі і дызайнерамі, а яшчэ лепш — дыджэямі і фатографамі. Між тым, у рэальным жыцці «месца пад сонцам» у сэнсе працы і заробку можна без турбот знайсці толькі кваліфікаванаму рабочаму. Таму, як заўсёды, маладыя людзі вагаюцца паміж марамі і матэрыяльным дабрабытам. Безумоўна, ідэальны варыянт — спалучаць задавальненне і грошы, але гэта ўдаецца далёка не ўсім.

— Трэба перш за ўсё арыентавацца на любімую справу, — перакананы Віталь Кірэеў. — А па-другое, вызначыць базавы ўзровень сваёй адукацыі. Трэба памятаць, што вышэйшая адукацыя не гарантуе, што вы станеце запатрабаваным спецыялістам. Асабліва калі ўзяліся не за сваю справу.

Віталя Кірэева падтрымліваюць псіхолагі: яны прама гавораць, што грошы на нелюбімай працы шчасця не прынясуць, бо негатыўную энергію ад перажыванняў на працоўным месцы чалавек непазбежна пацягне за сабой у сям'ю. Таму галоўнае для маладых людзей — вызначыцца, чаго ж яны хочуць, выбраць прафесію не толькі па разліку, але і па любові.

**Ілона ІВАНОВА.**

ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель» извещает акционеров, что собранием акционеров установлен срок перечисления дивидендов 30 апреля 2012 г. Размер дивидендов на одну акцию с налогом составляет 181,8 рубля. *УНН 400022426.*

## АБЗАЦ

◢ **Дзяржаўтаінспекцыя Мінска 2 красавіка зарэгістравала 293 дарожна-транспартныя здарэнні, што ў два разы больш, чым звычайна. Аварыі здарыліся з-за галалёдзіцы і снегападу. Людзі ў гэтых аварыях не пацярпелі.**

◢ Учора наша біятланістка Дар'я Домрачава выйграла спрынтарскую гонку на Кубку Расіі па біятлоне. На дыстанцыі ў 7,5 км яна дапусціла адзін промах. Другой стала нарвежка Сулемдал, трэцяй — расіянка Анастасія Загаруйка. Сёння пройдзе гонка пераследавання. Яе пераможца і атрымае прыз губернатара Цюмені — пазадарожнік Toyota RAV4 або 25 тысяч еўра.

◢ **Урачыстае мерапрыемства, прысвечанае памяці славутых беларусаў — братоў Луцкевічаў, заснавальнікаў Беларускага музея ў Вільні, — пройдзе 5 красавіка ў Вільнюскай ратушы. У гэты ж дзень адбудуцца і іншыя мерапрыемствы ў гонар 20-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Літоўскай Рэспублікай.**

◢ Мікрараён, які праектуецца пад рабочай назвай Зялёны бор, уключаны ў гарадскую рысу Мінска. Ён размяшчаецца ў раёне вёскі Калодзішчы. Новая тэрыторыя далучана да Партызанскага раёна сталіцы.

◢ **Сасна ўпала на будаўніка ў Навагрудскім раёне. Няшчасны выпадак адбыўся ў аздараўленчым лагеры, куды прыбылі будаўнікі для падрыхтоўкі аб'екта да сезона. Нечакана на аднаго з іх упала сасна даўжынёй 20,5 м і дыяметрам ствала 30 см. Рабочага з траўмамі рознай ступені цяжкасці даставілі ў бальніцу, дзе яго тэрмінова шпіталізавалі з пераломам косці чэрапа, закрытым пераломам шыйнага аддзела пазваночніка.**

◢ Пінскі гарадскі аддзел Следчага камітэта высвятляе акалічнасці гібелі 21-гадовага мясцовага жыхара. Цела маладога чалавека 2 красавіка знайшлі і дасталі з ракі Піна ў раёне вуліцы Столінскай вадалазы. Яны пачалі пошукі пасля таго, як напярэдадні вечарам у міліцыю паступіла паведамленне ад мясцовага жыхара, што з моста, магчыма, упаў чалавек. Прычыну смерці высвятляе судова-медыцынская экспертыза. Разглядаецца некалькі версій трагедыі, у тым ліку самагубства. Загінулы быў рабочым аднаго з мясцовых прадпрыемстваў.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ **Брытанскія паліцэйскія разбілі акно машыны, якая належала 80-гадоваму Гордану Вільямсу. Як высветлілася, інцыдэнт адбыўся ў рамках аперацыі па выратаванні... плюшавай цацкі. Цацачны сабака ляжаў на заднім сядзенні аўтамабіля, што стаяў на паркоўцы. Выпадковы мінак убачыў яго, вырашыў, што гэта сапраўдны сабака, і выклікаў паліцыю. Паліцэйскія таксама не зразумелі, што гэта цацка, і разбілі акно, каб вызваліць жывёліну, бо спужаліся, што сабака загіне ад перагрэву. Калі высветлілася, што гэта не жывая істота, а плюшавая цацка, паліцэйскія вярнулі сабаку на месца і там жа пакінулі запіску з тлумачэннямі. Цяпер Гордан Вільямс павінен атрымаць кампенсацыю ў памеры 180 фунтаў.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# САМЫ ЧАС ДЛЯ ЎСТАЛЯВАННЯ НОВАГА ЎЗРОЎНЮ АДНОСІН

**Такую думку адносна стасункаў Беларусі і ЕС выказаў на прэс-канферэнцыі ў БЕЛТА вядомы расійскі адвакат, доктар палітычных навук Аляксей БІНЕЦКІ .**

У цяперашнім канфлікце з Еўрапейскім саюзам Беларусь, як і ў папярэдніх канфліктах, займае дастаткова ўзважаную пазіцыю, лічыць вучоны. Калі лідар краіны або вышэйшыя чыноўнікі часам вымушаныя дапускаць жорсткую рыторыку, то яна цалкам апраўданая. З боку Беларусі ўсё адкрыта, зразумела, усе тлумачэнні з нагоды прэтэнзій дадзеныя, і яны вычарпальныя.

— Трэба знаходзіць за сталом перамоў кансэнсус і разуменне, у якіх сферах можна і патрэбна супрацоўнічаць, і ад палітызаванай рыторыкі, у тым ліку і па правах чалавека, пераходзіць да рэальнай сумеснай працы, — сказаў ён. — Калі еўрапарламентарыяў нешта не задавальняе ў правах чалавека ў Беларусі, тады я рэкамендую ім пацікавіцца ў Стасбургскім судзе па правах чалавека, якая краіна лідзіруе там па колькасці зваротаў. Гэта — не Беларусь, а Расія.

Санкцыі — лепш, чым вайна, пытанне толькі ў тым, дзеля чаго, хто і калі іх выкарыстоўвае, заўважыў Аляксей Бінецкі. Адносна Беларусі санкцыі ўводзіліся неаднаразова. Сэнс іх сёння — палітычны ціск пад матывам парушэння правоў чалавека, адсутнасці пэўнай свабоды і г.д. Гэта старая песня, прадыктаваная тым, што Беларусь сёння — апошняе месца ў Еўропе, дзе еўрапарламентарыі, у тым ліку, могуць апраўдваць свае высокія заробкі і пенсіі.

«Крытыкаваць у Еўропе больш няма каго. Разабраліся з Сербіяй, з іншымі падобнымі рэгіёнамі. З боку Еўрасаюза, думаю, усё скончыцца тады, калі крызіс, які абавязкова будзе, крызіс сацыяльны, фінансавы, эканамічны, прымусіць еўрапейскіх чыноўнікаў звярнуць увагу на ўласныя праблемы. Рыторыка ЕС сёння прадыктаваная кан'юнктурай. Па-мойму, еўрапарламентарыі яшчэ не да канца зразумелі, што ў краінах, якія ўваходзяць у Еўрасаюз, ёсць праблемы значна больш важныя і сур'ёзныя, чым прыдзіркі да беларускай дзяржавы».

Расійскі палітолаг упэўнены, што ўтварэнне такога еўраазіяцкага канклава як Расія-Казахстан-Беларусь, для Еўрасаюза і ЗША азначае пройгрыш у глабальнай стратэгіі «падзяляй і ўладар».

«Праблему імкнуцца гвалтоўна накачваць, бо не ўдаецца дасягнуць выніку, які, насамрэч, не зусім зразумелы. Ёсць Саюз Расіі і Беларусі, які дзейнічае, ёсць Мытны саюз, ёсць еўразійская прастора, зваротнага шляху ўжо не будзе. А такая «накачка» шкодзіць усім удзельнікам працэсу. Бамбіць немагчыма, і падстаў няма. І гэта ведаюць тыя, хто бывае ў Беларусі, хто ведае гэту краіну», — сказаў Аляксей Бінецкі.

— Насамрэч я лічу, што беларусы — занадта мяккія людзі, і дарэмна не ўступаюць у канфлікт. Зараз самы час для ўсталявання новага ўзроўню адносін — павінна быць у добрым сэнсе контрпрапаганда. Ад гэтага ў сучасным свеце нікуды не падзецца. Трэба займацца прасоўваннем сваіх ідэй, даносіць да людзей праўду. Нічога саромнага ў гэтым няма. Калі табе плююць у твар, то нармальны чалавек адэкватна рэагуе. Калі гэта палітычны гвалт, то і адказваць трэба гэтакім жа палітычным гвалтам. Так уладкаваны свет. Нельга абараніць сябе, не маючы мускулатуры, — рэзюмаваў свае погляды на ўзаемаадносіны паміж Беларуссю і ЕС палітолаг.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## ЗАСТАЛІСЯ БЕЗ ЭЛЕКТРЫЧНАСЦІ

На Віцебшчыне ў выніку праходжання моцнага ветру з парывамі да 15-20 метраў у секунду 2-3 красавіка адбыліся аварыйныя адключэнні электразабеспячэння ў амаль што палове раёнаў вобласці: у 10 з 21. Стыхія гаспадарыла ў Гарадоцкім, Глыбоцкім, Аршанскім, Лёзненскім, Пастаўскім і іншых раёнах. Усяго была адключана 21 лінія электраперадач, 396 трансфарматарных падстанцый, 174 населеныя пункты, 30 фермаў. Паводле звестак на раніцу 3 красавіка заставаліся абясточанымі: лінія электраперадач, тры трансфарматарныя падстанцыі, столькі ж населеных пунктаў (у Аршанскім раёне).

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# АЙЧЫННЫЯ ВАЛЁНКІ, РАСІЙСКІ ШАЛЬ — І БЕЛАРУСКА ПЕРАСЯГНЕ ПА ШАРМЕ ЛЮБУЮ ФРАНЦУЖАНКУ

**Смілавіцкія валёнкі ў прадстаўленні патрэбы не маюць. Што мінулай зімой, што гэтай — да прадпрыемства выстройваліся чэргі пакупнікоў, прычым не толькі з самой Беларусі. Прадукцыя на складах не затрымлівалася. Аднак Смілавіцкая валюшна-лямцавая фабрыка не стала ігнараваць 30-ю, юбілейную, міжнародную выставу-кірмаш «Белтэкстлегпрам» па аптовым продажы тавараў лёгкай і тэкстыльнай прамысловасці, што адчыніла свае дзверы для наведнікаў у сталіцы ў выставачным павільёне «Белэкспа» на Янкі Купалы, 27. Здавалася, які сэнс? Каб наладзіць новыя кантакты, прапанаваць аптавікам навінкі, якія шараговы пакупнік павінен будзе пабачыць у продажы ў бліжэйшыя часы.**

Натуральна, прыехалі са сваёй «разынкай» на форум і прадстаўнікі фабрыкі. Гэта раней, магчыма, можна было сказаць: просты, як валёнак. Цяпер як іх толькі не аздабляюць! Навінка прадпрыемства — гэта цёплы абутак на тэрмаэластапластычнай падэшве, аздоблены натуральным футрам. Або іншай фурнітурай: напрыклад, вялікімі гузікамі.

— Такая падэшва лепш захоўвае цяпло і не трэскаецца на марозе, — патлумачыла спецыяліст аддзела продажаў фабрыкі Таццяна Сабан.

Пакуль гэта толькі ўзор — для вывучэння попыту. Таму і магчымую цану на навінку сказаць цяжка. А тыя валёнкі, што ўжо вырабляюцца, каштавалі сёлета ў розніцы — і мужчынскія, і жаночыя мадэлі — ад 100 да 285 тысяч рублёў за пару. Дарэчы, сярод шматлікіх замежных кліентаў Смілавіцкай валюшна-лямцавай фабрыкі, не выключана, могуць у бліжэйшай перспектыве з'явіцца Германія і Нідэрланды: пакуль туды пастаўляліся толькі ўзоры прадукцыі. А потым, глядзіш, і да буйных партый валёнак дойдзе.

Колькі бываю на выставах, памятаю, што Жодзінскае ААТ «Белфа» таксама ніколі не прыязджае без навінак. Не стаў выключэннем і гэты раз.

— Мы прывезлі новую калекцыю жаночай вопраткі са штучнага футра, распрацаваную з удзелам Беларускага цэнтра моды. Гэта курткі, камізэлькі, пінжакі, футры, паліто. Вось, напрыклад, выраб пад натуральную норку, — дэманструе ўзоры маркетолаг прадпрыемства Настасся Кліцунова.

А мне спадабалася мадэльная жаночая куртка пад кажух — з дабаўленнем валокнаў воўны для паляпшэння ўласцівасцяў вопраткі: і цёпла, і знешне яна выглядае даволі эфектна. Пацікавіўся цаной. Высветлілася, што з улікам гандлёвай надбаўкі такая куртка будзе каштаваць каля 600 тысяч рублёў. Пагадзіцеся, не так і дорага.

— Наша новая калекцыя — моладзевая. Хоць гэта дастаткова ўмоўна: нават людзі ва ўзросце зараз імкнуцца апранацца ў стыльныя рэчы. Натуральнае футра многім не па кішэні, таму, думаем, наша прадукцыя будзе запатрабаванай, — разважае Настасся.

На стэндзе гэтага ж прадпрыемства можна азнаёміцца з прадукцыяй, выробленай з воўны: коўдрамі, падушкамі, чахламі для аўтамабільных сядзенняў. Натуральны матэрыял (80%), як слушна заўважыла суразмоўца, гэта і здарова і карысна. Цана пытання? Скажам, коўдру памерам 215х195 у розніцы можна набыць прыкладна за 920 тысяч рублёў, чахол для аўтасядзення (некалькі расфарбовак, я асабіста ўпадабаў «пад рысь») — крыху больш за 120 тысяч рублёў.

...На выставах за гады працы ў большасці ведаеш ужо многіх экспанентаў. А тут — яўна «свежая» для форуму прадукцыя, так бы мовіць, новыя твары!

— Вы маеце рацыю. Мы наведалі вашу выставу ўпершыню за апошнія сем гадоў, — прыязна ўсміхаецца начальнік аддзела маркетынгу Паўлавапасадскай хустачнай мануфактуры Сяргей Чукашоў. — У савецкія часы Беларусь была для нас добрым рынкам збыту. Цяпер хацелі б яго зноў вярнуць.

Па шчырасці, сем гадоў таму прадстаўнікі мануфактуры вярнуліся з нашай краіны на радзіму з вялікім спісам патэнцыяльных кліентаў. Аднак потым яны перайшлі да аднаго-адзінага беларускага індывідуальнага прадпрымальніка, які працаваў напрамую з расіянамі. Прынамсі, рабіў гэта цалкам афіцыйна. Цяпер на Паўлавапасадскай хустачнай мануфактуры спадзяюцца дзякуючы выставе заключыць дагаворы на аптовыя пастаўкі з іншымі партнёрамі. Аднак мяне найперш цікавіць іншае пытанне: наколькі славутыя шалі запатрабаваныя ў сучасным свеце — свеце гламуру?

— Што вы, наш тавар зноў паўсюдна ўваходзіць у моду! І асабліва — у моладзі! Прычым не толькі ў самой Расіі. Павялічваем экспарт, у Францыі, паверце мне, на нашы шалі — сапраўдны бум! — горача даводзіць мне суразмоўца. І далей «чытае» сапраўдную займальную лекцыю на тэму гэтага, як аказалася, моднага аксесуара.

Прываблiваюць спажыўца шалі, хусткі, кашнэ, насоўкі найперш сваёй натуральнасцю: гэта або чыстая воўна, або шоўк. А вось далей ёсць адрозненні як па модзе ў канкрэтных рэгіёнах або краінах, так і па функцыянальнай прыналежнасці рэчы.

— Калі вярнуцца да той жа Францыі, то там шалі — найперш упрыгажэнне, аксесуар, прычым аддаецца перавага класічным малюнкам. У Расіі спажывец выбірае ў тым ліку цёплую і прыгожую рэч. Думаю, беларускія спажыўцы пойдуць па гэтым жа шляху, — распавёў Сяргей Чукашоў.

Дарэчы, што датычыцца цаны, дык нашым спажыўцам расійскія вытворцы далі прэферэнцыю: тавар індывідуальнаму прадпрымальніку адпускаецца на 18 працэнтаў (стаўка ПДВ) ніжэй. Выходзіць, што беларускаму пакупніку, што расійскаму прадукцыя мануфактуры каштуе практычна аднолькава.

...Неяк так выпадкова склалася, што аповед пра экспанентаў выставы атрымаўся пераважна з «жаночым» ухілам. А, можа, і не выпадкова? Хочацца, нарэшце, сапраўднай вясны, цяпла... Каб на вуліцах з'явіліся жаночыя прыталеныя сілуэты...

— Гэта ж лэдзі! Як інакш? — слушна агучыў відавочнае начальнік аддзела маркетынгу і збыту віцебскага прадпрыемства «Сцяг індустрыялізацыі» Сяргей Свіркоўскі. Прадпрыемства робіць упор менавіта на класіку, якая і ў гэтым сезоне будзе ў фаворы ў капрызлівай моды — жаночыя сукенкі, спадніцы, штаны. У асартыменце і адзенне для школьніц: строгае, элегантнае, але падкрэсліваe прыгажосць. Не пакрыўдзілі на прадпрыемстве і не самых худзенькіх прадстаўніц слабага полу, выпусціўшы для іх адзенне для прагулак, адпачынку, а таксама аксесуары ў дадатак — шалікі, сумкі. Нашу ж увагу найперш прыцягнула навінка: калекцыя адзення (8 мадэляў) для цяжарных жанчын: сукенкі, сарафаны, штаны — усё з падтрымнымі бандажамі. Калекцыя толькі з'явілася, але яе ўжо з месяц як можна знайсці ў продажы.

— Тут мы вырашылі зрабіць выключэнне, аддаўшы перавагу светлым — бэжавым, пастэльным — тонам у адзенні. Да калекцыі ёсць цікавасць, у тым ліку і таму, што каштуе яна недзе ў 1,5 раза танней за замежныя аналагі. Напрыклад, прывезеная да нас аднекуль сукенка прадаецца ў гандлі па 500-600 тысяч, штаны — па 370-400 тысяч рублёў. Адпускная ж цана нашых адпаведных вырабаў складае 210-240 тысяч і 160-190 тысяч рублёў. Калекцыя адзення для цяжарных жанчын разлічана на суайчыннікаў з сярэднім дастаткам, — расказаў суразмоўца.

...Веснавая выстава-кірмаш «Белтэкстлегпрам» сабрала сёння пад адным дахам больш за 150 кампаній, у тым ліку і замежных. Расказаць пра ўсіх немагчыма — лепш пабачыць усё на свае вочы. Форум будзе працаваць па 5 красавіка, уваход — вольны. У рамках выставы-кірмашу будуць праходзіць модныя паказы калекцый новага сезона. Дарэчы, некаторыя кампаніі прама на месцы арганізавалі розничны продаж сваёй прадукцыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ■ Медыяпрастора

### «ПЛАНЕТА»




**У сакавіку часопіс «Планета» прапануе сваім чытачам актуальныя матэрыялы, прысвечаныя падзеям палітычнага жыцця — у тым ліку аналіз кар'еры і дзейнасці новаабранага прэзідэнта Германіі, а таксама працэсаў, якія адбываюцца вакол ірана-ізраільскага канфлікту.**

Тым, хто цікавіцца высокімі тэхналогіямі, будуць даспадобы артыкулы пра наступствы і перспектывы надыходу камп'ютарнай эры і выкарыстання разумных механізмаў. А аматары навукі даведаюцца, калі чалавек дасягне Марса, што знаходзіцца пад ледзяной шапкай Антарктыды, і атрымаюць адказ на пытанне, ці ўсім навукоўцам можна верыць.

Чытачы, якіх вабяць таямніцы гісторыі, змогуць прачытаць пра старажытны горад Камянец, пра тое, хто і чаму забіў егіпецкага фараона Тутанхамона, а таксама пазнаёміцца з юнымі лётчыцамі-гераінямі, якія змагаліся з фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Тыя ж, хто марыць пра далёкія падарожжы, больш даведаюцца пра чароўную і таямнічую Індыю, а таксама пазнаёмяцца з малавядомым кутком Еўропы — Зямлёй Баскаў.

**Таццяна ЛАМОНАВА.**

### «БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА»

**Сакавіцкі нумар часопіса «Беларуская думка» адкрывае эксклюзіўнае інтэрв'ю Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Рэспублікі Беларусь Леаніда Гулякі «Згода — вынік узаемаразумення». У ім раскрываюцца шматлікія аспекты існуючай на сённяшні дзень у нашай краіне міжканфесійнай і міжнацыянальнай сферы, якія характарызуюцца верацярпімасцю і паважлівасцю ўзаемаадносін.**

Цікавасць выкліча ў чытача і артыкул «Кіраўнік машэраўскага прызыву» кандыдата гістарычных навук Аляксандра Акуліка, у якім расказваецца пра найбольш значныя эпізоды жыцця і дзейнасці вядомага дзяржаўнага дзеяча Беларускай ССР Уладзіміра Бровікава. Герою руска-турэцкай вайны 1877—1878 гадоў, нашаму земляку, генерал-фельдмаршалу Расійскай арміі Іосіфу Гурко прысвечаны артыкул Э.Карніловіча «Браў цвярдыні на Балканах». Таксама можна даведацца пра развіццё ў нашай краіне парашковай металургіі і выкарыстанне яе дасягненняў адным з флагманаў беларускай прамысловасці — Мінскім трактарным заводам; прааналізаваць прычынна-выніковыя сувязі глабальных эканамічных крызісаў і даведацца, якую карысць можа прынесці сусветнай супольнасці вопыт Беларусі, у якім зроблена спроба сфарміраваць такую мадэль развіцця, якая спалучала б у сабе дзяржаўнае рэгуляванне і сацыяльную арыентацыю эканомікі.

**Сяргей ЖОЛУД** ■

## ПАМЫЛІЛАСЯ

**Адзінаццацігадовая мінчанка пажартавала з сяброўкі, адправіўшы ёй SMS пра забойства, але памылілася нумарам. Жартаўніца памылілася кодам апарата, і паведамленне ў 3.50 прыйшло пабочнаму чалавеку, паведамілі ў Партызанскім РУУС сталіцы.**

1 красавіка школьніца вырашыла разыграць сваю сяброўку, якая год таму з бацькамі паехала жыць у ЗША, і адправіла ёй «смешнае» SMS-паведамленне. Дзяўчынка ўначы набрала тэкст на тэлефоне са словамі «Я закапаў труп, Касы, што рабіць далей?», адправіла яго сяброўцы і легла спаць. У гэты ж час у Мінску ў 3.50 ночы жанчыну разбудзіў званок тэлефона. Прачытаўшы атрыманае паведамленне, яна спужалася і разбудзіла мужа. Мужчына вырашыў паведаміць пра атрыманае SMS у міліцыю.

Прыбыўшыя супрацоўнікі міліцыі ўдакладнілі абставіны таго, што адбылося, і нумар тэлефона адпраўшчыцы. У хуткім часе праваахоўнікі даведаліся і яе дакладны адрас. Па названым адрасе дзверы адчыніў мужчына, які не разумеў, чаму прыехала міліцыя. У ходзе разбору высветлілася, што паведамленне адправіла дзяўчынка, якая нават не падазравала, што памылілася нумарам.

Бацькі доўга прасілі прабачэння і паабяцалі, што такога больш не паўторыцца. Праводзіцца праверка. Бацькі «жартаўніцы» могуць быць прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

**Кар. БЕЛТА.**

**Нестановичский сельский исполнительный комитет Логойского района Минской области**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь, га | Начальная цена (руб.) | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1. | д. Боброво-2 № 7 623285001601000018 | 0,25 | 5 000 000 | 500 000 |
| 2. | д. Боброво-2 № 9 623285001601000019 | 0,25 | 5 000 000 | 500 000 |
| 3. | д. Боброво-2 № 10 623285001601000020 | 0,25 | 5 000 000 | 500 000 |
| 4. | д. Буденичи № 1 623285002601000010 | 0,25 | 5 000 000 | 500 000 |
| 5. | д. Буденичи № 2 623285002601000011 | 0,25 | 5 000 000 | 500 000 |
| 6. | аг. Малые Нестановичи № 1 623285006101000053 | 0,25 | 7 500 000 | 750 000 |

Задаток перечисляется на р/счет 3600619111102, ЦБУ № 611 ф-ла № 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, МФО 153001601, УНН 600181671, Нестановичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901 **до 27.04.2012 г.** Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 4 мая 2012 г. в 11.00 по адресу: аг. Малые Нестановичи, ул. Центральная, 25 Логойского района Минской области, здание Нестановичского сельского исполнительного комитета.**

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 27 апреля 2012 г.**

Контактные телефоны:
**(8 01774) 73 1 35, 73 1 08, 20 341, (8 044) 599 09 48.**

**Наш сайт в интернете logoysk.gov.by**

Утерянный бланк строгой отчетности «Страховой полис обязательного медицинского страхования иностранных граждан» формы 2РН серии БВН, в количестве 1 штуки № 0101580 Филиала Белгосстраха по Минской области считать недействительным. *УНН 600013344.*

Утерянный бланк строгой отчетности «Страховое свидетельство обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории Республики Беларусь» серии ВС, в количестве 1 штуки № 6817390 представительства Белгосстраха по Червеньскому району считать недействительным. *УНН 600013344.*

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
4 красавіка 2012 г.
№ 7 (279)

УСЁ Ў ПАРАДКУ

# Добрыя ідэі таннымі не бываюць

Ірына АСТАШКЕВІЧ

**Парк адпачынку Фестывальны засадзілі хвоямі ў канцы 60-х мінулага стагоддзя. Хвоі з таго часу сталі сапраўдным лесам, які аблюбавалі не толькі вавёркі, якіх тут безліч, але і матулі з дзецьмі, закаханыя парачкі, фізкультурнікі-аматары і ўвогуле ўсе, хто шукае адпачынку на прыродзе.**

Доўгі час гэта была звычайная зялёная зона, якая нічым асаблівым не вылучалася. «Сасоннік» — так парк называюць у народзе — даволі значна змяніў сваё аблічча за апошнія гадоў дзесяць. Адбылося гэтае ператварэнне не імгненна, але ўжо цяпер жыхары бліжэйшых мікраёнаў station... 


Пакуль гэты праект існуе толькі на малюнку. Наяве гамяльчане ўбачаць яго летам.

— Будзе яшчэ лепш, — запэўнівае першы намеснік старшыні адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля Сяргей Кадола і раскрывае некаторыя сакрэты далейшага добраўпарадкавання гэтай зоны адпачынку і ўсяго раёна.

Сяргей Мікалаевіч абяцае, што ўжо сёлета будзе пакладзены пачатак стварэнню ў парку Фестывальны дзвюх новых алей. На адной з іх будуць размешчаны арыгінальныя паркавыя лаўкі. Прычым кожная — з пэўным сэнсам і нават гумарам: у выглядзе вялізнай далоні або акуляраў на аркушы газеты... Побач будзе алея закаханых. Прынамсі, пачатак ёй пакладзены некалькі гадоў таму: сімвалічнае металічнае дрэва кахання абчапілі «замкамі вернасці», як лісцем. Маладыя спецыяльна прыязджаюць у гэты парк на фотасесію і «зачыняюць» сваё каханне на дзівоснай «расліне». Цяпер вось гаворка не толькі пра тых, хто ўступае ў шлюб, але і пра тых, хто... думае пра развод. Для іх, напрыклад, увасобіцца ў жыццё канцэптуальны праект «лаўкі прымірэння», на якую інакш не сядзеш, каб не прыціснуцца адно да аднаго. Свая філасофія будзе і ў іншых кампазіцый, якія з'явяцца на алеі закаханых:

— Ідэя не танная, рэалізоўвацца будзе паступова. Мы спадзяёмся, што людзі будуць прыходзіць сюды адпачываць. Магчыма, парк Фестывальны стане месцам прыцягнення турыстаў. Цяпер вось шукаем магчымасці, як і хто будзе ўсю прыдуманую прыгажосць выраблць. Са знакамітым гомельскім паркам Паскевічаў нам супернічаць цяжка, але ж штосьці арыгінальнае мы людзям прапануем.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

# ГАСПАДЫНЯ МАЛЕНЬКАЙ ВЁСКІ

**— У нашай Барысаўцы ўсяго 49 чалавек засталося — хіба ж гэта вёска? — уздыхае староста Ганна Парфёнаўна Кузьмянкова. І ўзгадвае, як віравала тут жыццё ў пачатку 60-х, калі яна толькі-толькі прыехала сюды, у Клімавіцкі раён, за мужам і ўладкавалася ў калгас імя Калініна (цяпер «Сасноўка») бухгалтарам. Паўстагоддзя праляцела як імгненне: былі ў ім вёсны і зімы, радасць і смутак, нараджэнні і сыходы... Вёска паступова пусцела, моладзь, атрымаўшы адукацыю, раз'язджалася ў пошуках больш цікавых перспектыў...**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сын і дачка Ганны Парфёнаўны жывуць цяпер у Расіі: Мікалай — у Смаленскай вобласці, Таццяна — у Падмаскоўі. Бацькоў яны, безумоўна, наведваюць, але не так часта, як тым хацелася б — разы два на год. У дзяцей свае клопаты, свае сем'і і свае ўнукі, так што Ганна Парфёнаўна ўжо «двойчы прабабуля». Тым не менш, менавіта яе на працягу дзесяці апошніх гадоў аднавяскоўцы выбіраюць старастай вёскі. І ўвесь гэты час хата Кузьмянковых з'яўляецца — з дазволу гаспадароў — мясцовым «Домам сацыяльных паслуг». Пад дахам гэтага дома праходзяць вясковыя сходы. Сюды два разы на месяц прыязджае фельчар «з чамаданчыкам» — прывозіць лекі, мерае ўсім ахвотным ціск. Тут спыняецца бібліятэкарка са сваім кніжным багажом — прачытаныя кніжкі забірае, новыя выдае. У «Доме сацыяльных паслуг» выступаюць артысты — забаўляюць мясцовы люд.

— Неяк аж з Магілёва прыязджалі, вучылі нас беларускім танцам... Там адна такая крутая танцорка была — як пусцілася ў скокі, як падхапіла мяне!.. А я ўжо круціцца не магу, у мяне ногі баляць, — смяецца Ганна Парфёнаўна.

Да прыезду «гасцей» яна старанна рыхтуецца, чысценька прыбірае хату — «шурудзіцца», каб і чужым людзям, і сваім, мясцовым, стварыць утульнасць, каб яны засталіся задаволенымі. І не забывае сумяшчаць прыемнае з неабходным: рэгіструе кожнае наведванне ў спецыяльным сшытку, які выдалі ў Дамамерыцкім сельскім Савеце. Ёсць у Ганны Парфёнаўны і нумары тэлефонаў усіх асноўных раённых службаў і арганізацый. Калі што здарыцца, людзі ідуць да яе, каб «звязалася з кім трэба». Ну а ў астатні час староста сочыць за парадкам у вёсцы.

— Напэўна, гэта для вас цяжкаватая нагрузка? — цікаўлюся ў Ганны Парфёнаўны, якая праз два гады разменяе дзявяты дзясятак.

— Ну вядома ж, мне няпроста, — пагаджаецца яна. — Я ўжо і адмаўляцца хацела ад «пасады». Сказала пра гэта старшыні сельскага Савета Рэгіне Станіславаўне Кандрацьевай... «А каго ж мы выберам?!» — спытала яна. Я падумала — і сапраўды: маладзейшыя занятыя на працы ў гаспадарцы, якія з іх старасты?

Ну а тыя, хто не заняты, не падыходзяць па іншых «параметрах» — занадта неабыякавыя да спіртнога. І такіх нямала. Гэта біч вёскі, яе бяда. Ды і не толькі вёскі ці асобнага Клімавіцкага раёна.

— Насупраць нас жыла сям'я з пяці чалавек: маці, бацька і сыны — усе пайшлі на той свет ад п'янкі, — уздыхае Ганна Парфёнаўна. — І тут нічога не зробіш, як ні намагайся. Няма супраць гэтага ніякіх лекаў, калі людзі ўжо запушчаныя.

Яе ўласную сям'ю Бог ад «навалы» зберог. І не толькі Бог. Сваіх дзяцей Ганна Парфёнаўна і Васіль Піліпавіч выхоўвалі строга, вольнасцяў не дазвалялі.

— Па вечарах яны нідзе не бадзяліся. Выйду, бывала, на двор, крыкну: «Коля!.. Таня!..» — яны праз хвіліну дома. Так было ў нас заведзена. Часам прыйду з працы позна — дзеці ўжо спяць. Раненька на працу адыходжу — яны яшчэ спяць... Дзякуй, што свякроў гадавань дапамагала, пухам ёй зямелька.

...Як добрае, так і злое заўсёды вяртаюцца да чалавека. Гэта «залатое правіла», закон «раўнавагі». Жылі Кузьмянковы дружна, працавалі сумленна. «Мільёнаў» не назапасілі, затое вырасцілі добрых дзяцей, дачакаліся ўнукаў і праўнукаў. У вёсцы пра іх дрэннага слова не скажуць... Старшыня сельскага Савета старасту хваліць: «Працаваць з ёю лёгка!..».

Па панядзелках і чацвяргах у вёску да азначанага часу прыязджае аўтакрама і спыняецца каля дома Кузьмянковых. Людзям, якія па звычцы прыходзяць загадзя, часам даводзіцца чакаць. Але — не на вуліцы.

— Зімой усе заходзяць да нас у хату, разам сядзім, размаўляем, паглядаем у акно... Гаспадар мой паліць грубачку, — распавядае Ганна Парфёнаўна.

І хоць за вокнамі ўжо вясна, я выразна ўяўляю сабе гэту карціну: замеценая снегам вёска, адсунутыя фіранкі на акне, нягучная гамонка жанчын, цяпло ад напаленай печкі... Няхай і надалей саграе яно гаспадароў і гасцей гэтага ўтульнага дома.

**Наталля УЛАДЗІМІРАВА.**

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

# Вясна. Час адключаць святло?..

**Жыхар вёскі Міхейкі Слуцкага раёна Мікалай Нікіфаравіч Ганчарэвіч звяртаецца ў нашу рэдакцыю не ўпершыню. Год таму яго засмуціла сітуацыя з вонкавым асвятленнем вуліцы Заводскай, на якой пражывае пенсіянер. Тады з падачы Мікалая Нікіфаравіча і іншых жыхароў вёскі мясцовы сельвыканкам (Бокшыцкі) прыйшоў да высновы, што дадатковае асвятленне на вуліцы Заводскай сапраўды патрэбна. І хоць новы ліхтар каштаваў нятанна, сельская ўлада ўсё ж выдаткавала грошы на яго ўстаноўку.**

Днямі рэдакцыя зноў атрымала ліст ад Мікалая Ганчарэвіча, напісанага ім «ад імя ўсіх пенсіянераў», якія пражываюць па вул. Заводскай у вёсцы Міхейкі Бокшыцкага сельсавета. Мікалай Нікіфаравіч зноў паскардзіўся на асвятленне: маўляў, выйшлі са строю лямпачкі, і мяняць іх ніхто не спяшаецца. А старым людзям цяжка хадзіць па неасветленай, ды яшчэ і гразкай пасля зімы вуліцы. «Мы звярталіся да кіраўніка сельсавета, ён паабяцаў разабрацца, але лямпачкі па-ранейшаму не гараць», — паведамлялася ў звароце.

...Набрала ўжо знаёмы нумар старшыні Бокшыцкага сельскага Савета дэпутатаў Уладзіміра Гарбенкі.

— Сельская ўлада не займаецца заменай лямпачак непасрэдна. Мы толькі павінны даць адпаведную заяўку раённым электрасеткам, што і было зроблена, — патлумачыў Уладзімір Віктаравіч.

Але раённыя электрасеткі (РЭС) працуюць па сваім графіку, іх брыгада выязджае на месца толькі тады, калі назбіраецца пэўная колькасць заявак. Дзеля адной лямпачкі ніхто нікуды не паедзе — занадта дарагое гэта задавальненне.

— Да таго ж з пачатку красавіка ў мэтах эканоміі фінансавых сродкаў вонкавае асвятленне будзе ўвогуле адключана ва ўсіх населеных пунктах раёна. Так што РЭСу няма рэзону займацца заменай лямпачак, — сказаў Уладзімір Гарбенка. — Сітуацыя такая, што кожнаму сельсавету неабходна ўкладвацца ў ліміт разлікаў за электраэнергію, вызначаны райфінаддзелам. Перарасход гэтага ліміту сельвыканкам павінен кампенсаваць за свае сродкі. Напрыклад, у нашым сельсавеце па выніках мінулага года атрымаўся перарасход электраэнергіі на суму 15 мільёнаў рублёў. Так што сёлета адключаем вонкавае асвятленне населеных пунктаў — пасля абавязковага ўзгаднення з райвыканкамам — нават раней, чым летась. Мясцовыя жыхары, пераважная іх большасць, ставяцца да гэтага з разуменнем. Атрымаецца сэканоміць грошы за кошт вясновых і летніх месяцаў, дык увосень, калі рана цямнее, зможам карыстацца электраэнергія больш-менш спакойна.

Праўда, заклапочанасць старшыні сельскага Савета выклікаюць пяць вёсак, размешчаных уздоўж участка трасы Мінск — Мікашэвічы. Участак і так з'яўляецца вельмі ажыўленым і аварыйна-небяспечным. Адключэнне ж святла ў «прыдарожных» вёсках можа пагоршыць і без таго складаную сітуацыю на дарозе.

— Таму збіраемся разам з начальнікам раённай ДАІ звярнуцца ў райвыканкам з хадайніцтвам: у гэтых населеных пунктах асвятленне не адключаць. Калі такі дазвол мы атрымаем, спадзяюся, што жыхары іншых, «адключаных» вёсак, паставяцца да гэтага з разуменнем і не ўспрымуць такое рашэнне мясцовай улады як нейкае «ўшчамленне» сваіх правоў, — сказаў Уладзімір Гарбенка.

Адключэнне вонкавага асвятлення ў сельскіх населеных пунктах раёна (сёлета — з пачатку красавіка да 15 верасня) — захад хутчэй вымушаны, і зразумела, што мясцовыя ўлады прымяняюць яго не ад добрага жыцця.

— Мы дзейнічаем па ўжо адпрацаванай схеме не першы год, — патлумачыў старшыня Слуцкага раённага Савета дэпутатаў Віктар Ражанец. — Кіраўнікі органаў улады пярвічнага ўзроўню ўзгадняюць графікі адключэння электрычнасці на сваіх тэрыторыях з намеснікам старшыні райвыканкама, які курыруе гэта пытанне, падпісваюць у яго адпаведнае пісьмо. Потым падаецца заяўка ў РЭС на адключэнне электраэнергіі... Дарэчы, гэта не азначае, што ўсе населеныя пункты будуць адключаны ў адзін дзень і час. Калі, напрыклад, у вёсцы ёсць школа, можна крыху пачакаць з адключэннем. Да ўвагі прымаюцца і іншыя фактары. Скажам, мы стараемся пакідаць асветленымі пад'езды да фермаў, куды людзі прыходзяць на працу, калі на вуліцы яшчэ цёмна... Словам, падыходзім да гэтага пытання дыферэнцавана. Зразумела, ёсць незадаволеныя. Тлумачым ім, што лепш рацыянальна расходаваць электрычнасць сёння, чым сядзець без асвятлення ўвосень.

Што датычыцца вёсак, якія прымыкаюць да трасы Мінск — Мікашэвічы (на ўчастку ад населенага пункта Гацук да г. Слуцка), яны маюць агульныя з дарогай электрасеткі. Адключыш вонкавае асвятленне ў гэтых вёсках — не будзе яго і на трасе.

— А ў нас і так людзі ахрысцілі гэты ўчастак трасы «дарогай смерці» — яна вузкая, двухпалосная і вельмі небяспечная. Таму ў такіх вёсках, як Гарадзішча, Заполле, Ленькі ці Шышчыцы, адключаць электрычнасць, я лічу, нельга. Хоць і давядзецца тлумачыць незадаволенаму насельніцтву з іншых вёсак, чаму ў Шышчыцах «гарыць», а ў іх «не гарыць». Але лепш лішні раз патлумачыць, чым атрымаць чарговую трагедыю на дарозе, — лічыць Віктар Ражанец.

**Наталля КАРПЕНКА.**

# Хуткая і... душэўная

**У Полацкім раёне днямі ўпершыню ў краіне выйдзе ў рэйс сацыяльная карэта «Хуткай душэўнай дапамогі».**

Прадастаўленне новай паслугі стала магчымым пасля вывучэння работнікамі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнай абароны насельніцтва патрэбы ў «душэўнай дапамозе» саміх грамадзян. Цэлая брыгада: цырульнік, медыцынскі і сацыяльны работнікі і іншыя (усяго пяць чалавек) будуць кожны тыдзень прыязджаць да адзінокіх жыхароў раёна.

Прычым брыгада, якая працуе пад дэвізам «Ляцім на дапамогу!», не абмяжуецца толькі прыбіраннем у доме, стварэннем новага іміджу і праверкай стану здароўя... «Душэўныя госці» таксама абмяркуюць з бабулямі і дзядулямі бягучыя праблемы, пацікавяцца клопатамі сваіх кліентаў, пагутараць на разнастайныя тэмы за кубачкам чаю.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# На цвярозую галаву

**Забарона на продаж пладова-ягадных він дзейнічала ў Слуцкім раёне з чэрвеня мінулага года, пазней гэтая практыка была распаўсюджана і на некаторыя іншыя раёны Міншчыны: Бярэзінскі, Лагойскі, Старадарожскі, Крупскі, Любанскі, Салігорскі. І ў 2012 годзе вырашана пакінуць гэтую забарону.**

Відавочна, што той, каму вельмі трэба, і ў суседнім раёне віно купіць. І ўсё ж, як адзначаюць спецыялісты, за час дзеяння такога эксперыменту, колькасць злачынстваў, здзейсненых у нецвярозым стане, зменшылася на некалькі соцень. Значыць, ёсць сэнс прадоўжыць яго і сёлета. Пакуль забарона на продаж «чарніла» падоўжана да 1 ліпеня 2012 года. Зразумела, гэта не адзіны захад па барацьбе са злоўжываннем спіртнымі напоямі: у вобласці праводзяцца спецыяльныя рэйды, абмяжоўваецца час продажу танных спіртных напояў, асабліва злосныя «аматары» накіроўваюцца ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі. Не спыняецца і барацьба з «самагоншчыкамі».

**Марына ХІДДЖАЗ.**

ДАПАМОГА

# ТАКСІ, ЯКОЕ НЕ СПАЗНЯЕЦЦА

***Праект пад назвай «Сацыяльнае таксі», што стартаваў у Мінску напрыканцы 2010 года, карыстаецца вялікім поспехам сярод жыхароў сталіцы***


Юлія Карпава заўсёды на тэлефоне


Вадзіцель Максім Баталаў працуе па шчыльным графіку.



Скарыстацца спецыяльным транспартам жыхарам сталіцы можна, патэлефанаваўшы ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва свайго раёна, — менавіта там складаюць план выклікаў сацыяльнага таксі. Заказваць машыну трэба загадзя.

— Заявак вельмі шмат, у нас чэргі, час распісаны амаль да сярэдзіны мая, — расказвае спецыяліст па сацыяльнай рабоце аддзялення першаснага прыёму, інфармацыі, аналізу і прагназавання Юлія Карпава. — У мінулым годзе ў нас было каля чатырох тысяч зваротаў, за тры месяцы гэтага — ужо каля тысячы.

Сёння ў Тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Заводскага раёна Мінска пакуль адна машына — плануюць вось-вось атрымаць другую, патрэбную як паветра.

Часцей за ўсё машыну заказваюць для падвозу ва ўстановы аховы здароўя, рэабілітацыйныя комплексы і цэнтры.

— Кожную нядзелю адна наша бабуля заказвае машыну, каб наведаць царкву, — распавядае Юлія Карпава. — А яшчэ падвозім дзетак — у заапарк, батанічны сад, на розныя выставы, канцэрты і спартыўныя мерапрыемствы.

Працоўны дзень сацыяльнага таксі пачынаецца ў 5.40 раніцы, бо да 6.30 трэба ўжо завезці першага хворага на лячэнне. Угледаюся ў паперы вадзіцеля і здзіўляюся: графік такі шчыльны, што за 15 хвілін трэба паспець з аднаго канца горада ў другі!

— Тым не менш, паспяваем заўсёды! — адзначае вадзіцель Максім Баталаў. — Большасць маіх пасажыраў ездзіць у паліклінікі і бальніцы, а там усё прывязана да канкрэтнага часу. Спознішся — не атрымаеш кваліфікаванай дапамогі, ад якой, магчыма, залежыць не толькі здароўе, а нават і жыццё.

Адзін з пасажыраў, Мікалай Пятровіч, — інвалід 1 групы. Каб дабрацца з дому да 4-й бальніцы, патрэбны тры перасадкі на грамадскім транспарце, ды яшчэ прайсці колькі метраў. А з хворымі нагамі зрабіць гэта проста не рэальна.

— Мне ў бальніцу трэба ездзіць тры разы на тыдзень. Таму сацыяльнае таксі для мяне — выратаванне! — дзеліцца Мікалай Пятровіч.

Наступная кропка ў нашым маршруце — Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў. Сюды мы едзем забіраць траіх малых з мамамі. Хлопчыка на інваліднай калясцы хутка і з максімальнай зручнасцю загружаюць у салон разам з каляскай пры дапамозе спецыяльнага пад'ёмніка. Спецыяльныя фіксатары і поручні гарантуюць бяспеку падчас паездкі.Транспарт абсталяваны кандыцыянерамі і сотавай сувяззю.

Маці Галіна Уладзіміраўна разам з сынам карыстаюцца паслугай таксі трэці раз, але жанчына ўжо ўпэўнена, што перамяшчэнні па горадзе для яе значна спрасціліся.


У такім таксі перамяшчэнне па горадзе значна спрашчаецца.

**Вызваць сацыяльны аўтатранспарт на бясплатнай аснове могуць:**

*— інваліды 1 групы;*

*— інваліды-калясачнікі;*

*— дзеці-інваліды да 18 гадоў;*

*— непрацуючыя інваліды 2 групы, старэйшыя за 70 гадоў, памер пенсіі якіх не перавышае 1,5 базавага пражытачнага мінімуму.*

**На ўмовах частковай аплаты ў памеры 15% базавай велічыні на момант звароту паслуга транспарту прадастаўляецца:**

*— інвалідам 2 групы, старэйшым за 70 гадоў, памер пенсіі якіх перавышае 1,5 БПМ.*

— Раней прыходзілася заказваць звычайнае гарадское таксі — за адну паездку аддавалі каля 60 тысяч рублёў. І так кожны дзень, — распавядае Галіна Уладзіміраўна. — Шкада, што даведаліся пра гэту паслугу не адразу. Рэкламуюць яе слабавата.

Працоўны дзень сацыяльнага таксі — дванаццаць гадзін. Бывае, машына заканчвае работу каля сямі-васьмі гадзін вечара. Але за перапрацоўку вадзіцелям не даплачваюць.

— Чым больш праходзіць часу, чым больш вопыту набываем, тым больш карэктуецца работа ў лепшы бок, — адзначае Юлія Карпава. — У 2010 годзе «Сацыяльнае таксі» запускалі як пілотны праект з асноўнай мэтай — паглядзець, ці будзе яно карыстацца попытам. Гарадскі бюджэт кампенсуе затраты на аказанне транспартных паслуг сацыяльнага таксі. А грошы сюды ўкладзеныя вялікія: прыблізны кошт за паўмесяца карыстання машынай — каля 16 мільёнаў рублёў. І транспарт ніколі не прастойвае.

**Марына БЕГУНКОВА.**
**Фота аўтара.**

# Прадпрымальніцтву можна навучыць

**У гэтым упэўнены ў Мінаблвыканкаме. Прычым лепш пачынаць такое навучанне са школы.**

Напрыканцы мінулага года ў вобласці арганізавалі вучэбна-практычны цэнтр «Школьная кампанія» пры інкубатары малога прадпрымальніцтва «МАП ЗАТ», размешчаным у Калодзішчах, што пад Мінскам.

Фінансаванне ўнікальнага для нашай краіны праекта ідзе за кошт абласнога бюджэту. Ужо выдадзены спецыяльны падручнік па асновах прадпрымальніцтва для факультатыўных заняткаў у школах вобласці, прачытаны курс лекцый у некаторых сярэдніх вучэбных установах. А ў чатырох з іх (у Салігорску, Нясвіжы, Мінскім і Барысаўскім раёнах) дзейнічаюць свае бізнэс-кампаніі, якія займаюцца, напрыклад, выпускам сувенірнай прадукцыі.

Да таго ж у снежні мінулага года быў аб'яўлены конкурс інавацыйных бізнэс-ідэй навучэнцаў Мінскай вобласці. Школьнікі падалі на яго 165 заявак, больш за паўсотні якіх прайшлі ў першы этап конкурсу, а пятнаццаць — у другі. Фінал гэтых школьных бізнэс-спаборніцтваў вырашана правесці ў красавіку на базе пухавіцкага прадпрыемства «Аўгуст-Бел». Пераможцы абавязкова атрымаюць прызы, а кожны з удзельнікаў конкурсу пасля заканчэння школы можа паспрабаваць рэалізаваць свой бізнэс-план на практыцы. Праекты на гэтыя спаборніцтвы былі прадстаўлены самыя розныя: ад аказання цырульніцкіх паслуг да арганізацыі харчовай вытворчасці. Да таго ж у вобласці будзе сфарміраваная база звестак моладзевых бізнэс-ідэй, інфармацыю з якой плануецца размясціць у адкрытым доступе, каб прывабіць зацікаўленых у іх ажыццяўленні прадпрымальнікаў.

А днямі на чарговым пасяджэнні Савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Мінаблвыканкаме абмяркоўвалася работа цэнтра «Школьная кампанія». Цяжкасцяў у яго пакуль нямала, перш за ўсё — арганізацыйнага і юрыдычнага кшталту, бо гэта, паўтаруся, пакуль адзіны ў рэспубліцы вопыт. Але ў Савеце спадзяюцца, што гэтыя пытанні вырашальныя.

**Марына ХІДДЖАЗ.**

НА ПРЫЁМЕ

# ДЗЕ КУПІЦЬ... ЗВЫЧАЙНЫ ЧЫГУНОК?

**Наш карэспандэнт пабываў на прыёме грамадзян, які праводзіла старшыня Шумілінскага раённага Савета дэпутатаў Ірына Новікава. Пажаданні і праблемы, агучаныя людзьмі, можна назваць тыповымі для ўсёй краіны. Бадай, толькі адно пытанне аказалася нестандартным: дзе можна купіць... звычайны чыгунок для печы?**

На момант майго прыезду адна наведвальніца была на прыёме, другая — чакала сваёй чаргі. Жанчына паказала мне артыкул з раённай газеты пра вёску, дзе жылі яе бацькі, — большасць жыхароў вёскі забілі немцы. Потым паскардзілася, што мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, ды ўлада не дапамагае... Гэтую ж газету яна паказала старшыні Шумілінскага райсавета дэпутатаў Ірыне Новікавай. Але атрымала карэктны адказ, што ўлада дапамагчы не можа, бо няма законных падстаў для пастаноўкі заяўніцы ў чаргу на атрыманне жылля. Яна жыве ва ўласным доме з мужам. Абодва яны — пенсіянеры, пенсіі атрымліваюць у такім памеры, што не могуць разлічваць на аказанне фінансавай дапамогі. А дом непрыгодным для пражывання не прызнаны.

Яшчэ адна грамадзянка прыехала на прыём аж з Мінска. У Шуміліна яе прывяла зноў жа жыллёвая «праблема». Састарэлая маці мінчанкі жыве адна ў сваім доме ў Шумілінскім раёне. У сацыяльную ўстанову яна пераязджаць не хоча. Ці не далі б бабулі з дачкой добрае жыллё з усімі выгодамі? Адказ адмоўны, бо для выдзялення жылля няма падстаў.

А вось наступны зварот — наконт дрэннай работы медыка з ФАПа — патрабуе ўважлівага вывучэння. Незадаволены грамадзянін, які патэлефанаваў старшыні райсавета, расказаў, што на ФАПе ў вёсцы Новікі, дзе жывуць каля 120 чалавек, часта парушаецца распарадак работы. Як ні прыйдзеш — дзверы зачынены. Вось і даводзіцца па медыцынскую дапамогу ехаць у суседнюю вёску Крывое Сяло, а гэта кіламетраў шэсць. Дарэчы, у вяскоўцаў і раней былі прэтэнзіі да свайго фельчара. Магчыма, яму няпроста своечасова дабірацца на працу з райцэнтра. Але ж людзі не павінны з-за гэтага цярпець.

Загадчыца сельскага клуба вёскі Сураўні Валянціна Рудзякова падзякавала за аднаўленне аўтобуснага маршрута Віцебск — Казьяны. Транспартнікі спачатку адмянілі маршрут, бо ён быў стратным. Адбылося гэта мінулай восенню. Але потым, у выніку ўмяшальніцтва мясцовай улады пытанне вырашылася станоўча.

Святлана Васільеўна Ігнаценка лічыць неабходным арганізаваць у гарадскім пасёлку Обаль добраўпарадкаваную пляцоўку, дзе можна было б рэалізоўваць прадукцыю з уласных падворкаў... А жыхароў вёскі Мікалаева турбуе, што не выкарыстоўваюцца вытворчыя будынкі, якія знаходзяцца на балансе Гарадоцкай птушкафабрыкі. Адкрылі б там нейкую новую вытворчасць і далі б людзям працу... І яны маюць рацыю: нерухомасць павінна «рухацца».

Самае незвычайнае пытанне задала вясковая жыхарка — пра чыгунок. Не прадаюцца яны ў Шуміліна, і ў Віцебску іх таксама няма. А калі дзе і прадаюць чыгункі, дык выробленыя ў Расіі. А нашы вытворцы хіба не могуць?

Дарэчы, раённы Савет дэпутатаў выкарыстоўвае розныя формы работы з людзьмі. Гэта прыёмы грамадзян, у тым ліку выязныя, «прамыя лініі», дні работы з насельніцтвам і гэтак далей. Штомесяц у кожным населеным пункце прадстаўнікі ўлады сустракаюцца з жыхарамі на сходах, наведваюць на даму пажылых грамадзян і праблемныя сем'і. Рабочыя групы (у складзе якіх работнікі аддзелаў і ўпраўленняў райвыканкама, супрацоўнікі аддзелаў унутраных спраў і аддзелаў па надзвычайных сітуацыях, спецыялісты тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання, дэпутаты) абыходзяць усе падворкі. Галоўная мэта — непасрэдны кантакт прадстаўнікоў улады і насельніцтва. Адначасова людзей агітуюць браць самы актыўны ўдзел у навядзенні парадку на зямлі, паведамляць пра небяспечнае становішча ў сем'ях і г.д.

У межах дня работы з насельніцтвам праходзіць прыём грамадзян старшынёй райвыканкама і яго намеснікамі, старшынёй райсавета дэпутатаў, аглядаюцца аб'екты сацыяльна-культурнай і вытворчай сфер сельсаветаў... Большасць з паднятых жыхарамі раёна пытанняў ужо вырашана. Калі людзі маюць рацыю, улада ідзе насустрач.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*Шуміліна — Віцебск.*

# Добрыя ідэі таннымі не бываюць

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)**

Між іншым, малыя архітэктурныя формы ў Гомелі не толькі з'яўляюцца, але і знікаюць (як маральна састарэлыя) або «пераязджаюць» на новае месца жыхарства. Вялізная курыца з залатым яйкам некаторы час была сімвалам Давыдаўскага рынка, а цяпер «перабралася» ў адзін з двароў — цешыць жыхароў шматпавярховак.

Запланаваныя мерапрыемствы распрацоўваюцца калегіяльна, іх зацвярджэнне не абыходзіцца без спрэчак. Але ж самая складаная праца — тая, што папярэднічае добраўпарадкаванню тэрыторыі. На працягу восені і зімы супрацоўнікі адміністрацыі абышлі літаральна ўсе прадпрыемствы, у тым ліку прыватныя. Будынкі і тэрыторыю навокал сфатаграфавалі з усіх бакоў. Здымкі сталі дакументамі, якія ляглі ў аснову канкрэтных рэкамендацый па добраўпарадкаванні. Раённыя ўлады лічаць неабходным па пунктах, з вызначэннем тэрмінаў выканання, падказваць кіраўнікам, што яны павінны зрабіць на сваіх аб'ектах. Напрыклад, адрамантаваць дарогу, бардзюр, агароджу, абрэзаць дрэвы, пафарбаваць фасады і г.д.

— Сёння сродкаў не хапае ўсім, — кажа першы намеснік старшыні адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля Сяргей Кадола. — Таму кіраўнікі не заўсёды ахвотна займаюцца добраўпарадкаваннем. Але мы кожнаму даём прадпісанне, зацверджанае рашэннем адміністрацыі. Яно з'яўляецца абавязковым для выканання. За невыкананне — штраф. Раней мы складалі пратаколы толькі на фізічных асоб: там мякчэй адказнасць, а вось сёлета ўзяліся і за юрыдычных асоб. Толькі за апошні месяц на гандлёвую сетку «Дабрабыт» складзены 4 пратаколы. Гэта не жарты. Калі штраф пасля павелічэння базавай велічыні складзе ад 2 да 10 млн рублёў, гэта будзе вельмі адчувальна.

Дарэчы, да добраўпарадкавання актыўна падключацца ўчастковыя міліцыянеры. Яны ўпаўнаважаны складаць пратаколы па выпадках безгаспадарнасці. Аглядныя камісіі таксама робяць рэйды па прыватным сектары. Заходзяць на падворкі да грамадзян з групы рызыкі, каб пракантраляваць і падказаць, дзе што не так. Летам праводзяцца рэйды з «урачыстым» уручэннем «букетаў» пустазелля нядбайным гаспадарам. Адначасова складаецца пратакол і выпісваецца штраф.

Мер стымулявання таксама дастаткова. Гэта перш за ўсё конкурсы па добраўпарадкаванні самага рознага ўзроўню. Вызначаюцца лепшыя па азеляненні сярод двароў і дворнікаў, домаўпраўленняў, вулічкамаў і іх старшынь... Узнагароды — ад удзячнага ліста да грашовых і каштоўных падарункаў. У прыватным сектары, дарэчы, кожны работнік камунальнага аддзела адміністрацыі таксама мае сваю зону адказнасці, узаемадзейнічае з вулічнымі камітэтамі.

— У нас ёсць такія актыўныя старшыні вулічкамаў, якія самі нам падказваюць адрасы «кропак» безгаспадарчасці — кажа Сяргей Кадола. — У мікраёне Прыбар ёсць вельмі актыўны старшыня Ігар Дзясятнікаў. Са сваімі прапановамі па добраўпарадкаванні ён выходзіць і на нашу адміністрацыю, і на гарвыканкам. Дзякуючы такой сумеснай рабоце ў мікраёне Прыбар-Заходні была заасфальтавана адна з вуліц — з разваротным кольцам, з пунктамі прыпынку. Цяпер старшыня вулічкама заклапочаны стварэннем пешаходнай дарожкі. Думаем вось, з якіх сродкаў гэта зрабіць.

Адна з праблем Савецкага раёна — дваровыя тэрыторыі. Тут яшчэ працаваць і працаваць. Добраўпарадкаванне двара ў сярэднім каштуе ад 200 да 300 млн. Гэта новыя паркоўкі, бардзюры, дарожнае пакрыццё, дзіцячыя пляцоўкі і г.д. Да канца года ў раёне з'явіцца 47 велапаркоўак — каля крам і аб'ектаў сацкультбыта.

— Потым будзем думаць і пра стварэнне веладарожак, — заўважае Сяргей Мікалаевіч.

Дробязяў у гэтай справе няма, лічаць у адміністрацыі раёна. Вонкавы выгляд абласнога цэнтра павінен адпавядаць усім сучасным патрабаванням і тэндэнцыям.

# АКТЫЎНЫ «ТРЭЦІ» ЎЗРОСТ!

## Больш за 300 брэсцкіх пенсіянераў з'яўляюцца слухачамі Інстытута трэцяга ўзросту

**«Майстэрства пажылога ўзросту заключаецца ў тым, каб з кожнай хвіліны жыцця здабываць новыя каштоўнасці», — сказаў некалі вядомы нямецкі пісьменнік Томас Ман. Менавіта гэтыя словы і сталі своеасаблівым дэвізам пры стварэнні на базе тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна г. Брэста Інстытута трэцяга ўзросту. Ён расчыніў свае дзверы ў лістападзе 2010 года дзякуючы рэалізацыі сацыяльнага праекта «Актыўны трэці ўзрост», распрацаванага спецыялістамі тэрытарыяльнага цэнтра і сацыяльна-педагагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна.**

### «Студэнты» на пенсіі

Атрымалася так, што брастаўчане ў гэтай галіне сталі сапраўднымі першапраходцамі. Асабістыя напрацоўкі па арганізацыі вольнага часу пажылых людзей яны ўмела сумясцілі з вопытам устаноў падобнага профілю, якія даўно і паспяхова працуюць у іншых краінах — Польшчы, Расіі, Германіі.

— Мэта гэтага праекта — дапамагчы пенсіянерам заставацца актыўнымі, адаптавацца да сучасных умоў жыцця, — расказала дырэктар тэрытарыяльнага цэнтра Жанна Стаціўка. — Пачыналі з некалькіх напрамкаў, а цяпер іх ужо сем, і спектр інтарэсаў пастаянна пашыраецца. Да адукацыйнага, гісторыка-краязнаўчага, рэдактарскага, творчай майстэрні і фізічнай актыўнасці далучыліся яшчэ такія напрамкі, як маральна-духоўны і культурны.

Спачатку Інстытут трэцяга ўзросту наведвалі толькі 60 слухачоў. З цягам часу іх колькасць павялічылася да 360, было створана 32 групы. Заняткі тут вядуць выкладчыкі і студэнты-валанцёры БрДУ, спецыялісты тэрытарыяльнага цэнтра і медыцынскага цэнтра «Доктар Вітум». Першы год навучанне было зусім бясплатнае, але потым з'явілася неабходнасць за асобныя кірункі ўвесці сімвалічную аплату. Як у сапраўдным інстытуце, тут праводзіцца пасвячэнне ў слухачы, а пасля заканчэння курса «студэнтам» выдаюцца пасведчанні і падзякі за дасягненне.

### Паспець у апошні вагон

Сустрэлася з незвычайнымі студэнтамі інстытута і папрасіла іх падзяліцца сваімі ўражаннямі. Святлана Аладзіна лічыць, што без камп'ютарнай граматы сёння абысціся немагчыма, таму яна не раздумваючы запісалася ў групу адукацыйнага напрамку. Ёй вельмі падабаецца маладая настаўніца Вольга Есмановіч, якая ўмее тлумачыць даходліва і на даступнай для ўсіх мове.

— Яшчэ нядаўна не ведала, з якога боку падысці да камп'ютара, — кажа Вяслава Скур'як, — але за кароткі час шмат чаму навучылася. Умею нават здымкі з фотаапарата «скідваць» у камп'ютар. Інфармтэхналогіі імкліва нясуцца наперад, і хочацца паспець хаця б у апошні вагон.



Самы высокі «рэйтынг» — у групы па аздараўленчым плаванні.

Віктар Барвінак так зацікавіўся камп'ютарам, што цяпер і свой вольны час прысвячае таму, што замацоўвае навыкі, набытыя на занятках, пакуль жонка глядзіць па тэлевізары любімыя перадачы. Па яго прызнанні, дзякуючы гэтаму апошні час нават менш стала сямейных канфліктаў. Ён запланаваў працягваць навучанне і ў наступным годзе — хоча асіліць карыстанне электроннай поштай, сацыяльнымі сеткамі, скайпам.

Вольга Есмановіч поспехамі сваіх падапечных задаволена. Па-першае, пенсіянеры паводзяць сябе сур'ёзна, дысцыпліну не парушаюць. Па-другое, тут кожны ставіць перад сабой мэту добра засвоіць урок, таму час ніхто не марнуе.



На занятках у групе па выяўленчым мастацтве.

### Творчы палёт

На занятках у творчай майстэрні інстытута пенсіянеркі з задавальненнем займаюцца крэатыўным рукадзеллем: вязаннем, вышыўкай, абрэзкавым шыццём (пэчварк), макрамэ, ніткаграфіяй... Чаго тут толькі няма, аж вочы разбягаюцца! Ажурныя шалі, кофтачкі, аздабленні, выкананыя з вялікім густам дэталі інтэр'еру... З такой надзвычайнай колькасцю экспанатаў самы час арганізаваць выставу, і нават, не адну. Што ні рэч — творчы палёт душы яе аўтара!

— Для кожнай з нас майстэрня — свайго роду аддушына, — тлумачыць студэнтка інстытута Святлана Буткоўская. — Гэта і занятак любімай справай, і зносіны, і абмен вопытам... У жанчын вочы свецяцца, калі яны асвойваюць нешта новае. Здорава, што нас тут сабралі, натхнілі на развіццё здольнасцяў.

— Загарэлася жаданнем стварыць кашулю ў нацыянальным стылі, — дзеліцца планамі Валянціна Пташыц. — Вырашыла ўсё рабіць па старажытных тэхналогіях, але трохі іх асучасніць. Дзеля гэтага пайшла ў бібліятэку, вывучаю альбомы па рукадзеллі. Ездзіла нават на сваю малую радзіму ў Моталь, каб пераняць вопыт у вядомай майстрыхі. Ёй ужо за 80 гадоў, але не кідае любімую справу і валодае многімі сакрэтамі старадаўняй вышыўкі. Атрымаўшы ад яе ўзоры, стала асвойваць тэхніку.

Жанчыны распавялі, што навучыліся тут даваць другое жыццё рэчам. Зараз у іх нічога не прападае дарма. У майстрых шмат творчых задумак і планаў. Хаця некаторым і давялося пачынаць амаль што з азоў, але працэс навучання ідзе, як тут кажуць, сямімільнымі крокамі. Многія студэнткі-пенсіянеркі перайшлі ўжо на другі ўзровень, дзе створаны ўмовы для карпатлівага адточвання іх майстэрства.

Параўнальна нядаўна ў майстэрні з'явілася яшчэ адна група — выяўленчага мастацтва, дзе навучаюць навыкам малявання ў розных тэхніках: аловак, акварэль, пастэль, алей.

### Ад ёгі да караоке

Заняткі ў групах узаемадапамогі пачаліся крыху пазней, чым у іншых, але ад ахвотнікаў іх наведваць няма адбою. З пенсіянерамі на розныя тэмы тут гутарыць святар, а яшчэ — псіхолаг тэрытарыяльнага цэнтра Вольга Сакалова.

— Мне на занятках хутчэй адводзіцца роля каардынатара, а не настаўніка, — лічыць Вольга Сакалова. — Мае падапечныя дзеляцца думкамі па вырашэнні розных праблем, па выхадзе з цяжкіх становішчаў, вучацца працаваць над захаваннем унутранай гармоніі.

Да кірунку фізічнай актыўнасці тут маюць дачыненне цэлых пяць груп: аздараўленчай гімнастыкі, гімнастыкі з элементамі ёгі, рухаў пад музыку, аздараўляльнага плавання, спартыўных гульняў. У кожнай групе ад 15 да 150 наведнікаў. Створаны валанцёрскі клуб, які рыхтуе добраахвотнікаў для работы з інвалідамі, і школа лідараў, дзе вывучаюць навыкі кіравання і развіваюць лідарскія якасці для павышэння актыўнасці пажылых людзей. А 60 слухачам культурнага кірунку бліжэй за ўсё наведванне тэатраў і кіно, удзел у літаратурнай гасцёўні, інтэлектуальныя гульні і караоке...

Словам, тут робіцца ўсё, каб «трэці ўзрост» не заганяў чалавека ў чатыры сцяны, не аддаляў яго ад актыўнага грамадства.

**Наталля ЖУРАЎЛЁВА.**

# Вялікая вада падбіраецца да падворкаў

**Друць, прыток Дняпра, выйшла на пойму ля Рагачова і пачала заліваць некаторыя падворкі горада і раёна на поўначы Гомельшчыны.**

У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС расказалі, што вада падтапіла тэрыторыі 28 домаўладанняў, аднак ад пабудоў знаходзіцца на адлегласці 20-70 метраў. Падтапленні, глыбіня якіх 15-20 см, пагрозы для жыццядзейнасці людзей не ўяўляюць. Па звестках Гомельскага абласнога цэнтра па гідраметэаралогіі і маніторынгу навакольнага асяроддзя, у цэлым паводкавая сітуацыя развіваецца спакойна. Уздым вады назіраецца на Дняпры, Бярэзіне, Сожы. Тут вада прыбывае ад 6 да 20 см за суткі. Аднак да небяспечных узроўняў далёка. На Прыпяці ўздым вады спыніўся, і некалькі сутак сітуацыя на гэтай палескай рацэ застаецца нязменнай.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**По объекту: «Реконструкция жилого дома № 4 по ул. Д. Сердича с надстройкой мансардного этажа»**

Унитарное предприятие «Белоир общественного объединения «Белорусское общество инвалидов «Реабилитация» информирует юридических и физических лиц о создании объекта долевого строительства.

**Заказчик-Застройщик** — УП «Белоир ОО БОИ «Реабилитация» зарегистрировано Минским горисполкомом решение № 739 от 5 июня 2001 года в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100195041. Юридический адрес: 220006, г. Минск, ул. Маяковского, 18, к. 9.

Режим работы: понедельник — четверг с 9.30 до 17.00, пятница с 9.30 до 16.00, обед с 13.00 до 13.45, выходные дни — суббота, воскресенье.

В течение предыдущих трех лет организацией строительство не осуществлялось.

Функции заказчика осуществляются собственными силами.

**Информация о проекте строительства:**

**Цель строительства** — реализация проекта по договору № С-4 от 10 июня 2010 г. о реализации права проектирования и строительства объекта «Реконструкция жилого дома № 4 по ул. Сердича в г. Минске, с надстройкой мансардного этажа» с УП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска».

**Объект долевого строительства** — надстройка мансардного этажа с квартирами типовых потребительских качеств общей площадью — 1599,3 кв. м. Нормативная продолжительность строительства 10,5 мес. Проект реконструкции жилого дома с надстройкой мансардного этажа разработан с учетом проекта капитального ремонта жилого дома. Все архитектурные, конструктивные и инженерные решения увязаны для всего сооружения в целом.

Реконструкция осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.

Начало строительства объекта — 2-й квартал 2012 года.

Окончание строительства — 1-й квартал 2013 г.

Месторасположение объекта — Фрунзенский район г. Минска, ул. Сердича, дом № 4.

**Состав общего имущества:** Межквартирные лестничные клетки, лестницы, крыши, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, элементы озеленения и благоустройства.

Для привлечения физических лиц и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 г. № 396, по состоянию на дату опубликования проектной декларации, предлагается 10 (десять) квартир, в т.ч.:

— трехкомнатных — общей площадью 60,0 кв. м — 3 квартиры;
— трехкомнатных — общей площадью 65,8 кв. м — 1 квартира;
— трехкомнатных — общей площадью 69,9 кв. м — 1 квартира;
— трехкомнатных — общей площадью 61,0 кв. м — 4 квартиры;
— четырехкомнатных — общей площадью 104,8 кв. м — 1 квартира.

Стоимость строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, — 7 245 000 (семь миллионов двести сорок пять тысяч) белорусских рублей за 1 кв. м, что эквивалентно 900 долларов США. Цена объекта долевого строительства является неизменной в долларовом эквиваленте на весь период строительства. Оплата взносов в долевое строительство производится по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Отделка квартир не выполняется.

Указанная в настоящей проектной декларации цена за 1 кв. м общей площади квартир и их количество считается действительной до момента опубликования новой проектной декларации.

**Застройщиком получены:**

— Акт выбора места размещения земельного участка для строительства Минского городского исполнительного комитета от 16.03.2010 г.;
— заключение РУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» № 474-60/11 от 28 июня 2011 г.;
— решение МГИ от 15 марта 2012 г. № 769 о разрешении строительства.

**Сведения о договорах подряда:**

Договор строительного подряда от 20.03.2012 г. № С-4-01, заключенный с ОДО «Стройтехоснова».

**Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить по адресу: г. Минск, ул. Маяковского, д. 18, тел.: (017) 223 58 72, (029) 615 50 73 (vel).**

*УНП 100195041*



**ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «БЕЛЭНЕРГОЗАЩИТА»**
**Годовой отчет эмитента ценных бумаг за 2011 год**
**Местонахождение: 220021, г. Минск, пер. Бехтерева, 7, тел. (8 017) 295 20 11**

*УНП 100098854*

| | | |
|---|---|---|
| Вид деятельности: строительство | | |
| Количество акционеров: всего - 233, в том числе юридических лиц | 1 | |
| физических лиц | 232 | |
| Начислено на выплату дивидендов | 132,8 | млн.руб. |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | 51,7 | руб. |
| Обеспеченность акции имуществом общества | 8,64 | тыс.руб. |
| Среднесписочная численность работающих | 378 | чел. |

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: Строительство - изоляционные работы.

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2011 ГОД** млн.руб.

| Наименование показателей | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 39495 | 26327 |
| Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 6578 | 4307 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 32917 | 22020 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 29177 | 19625 |
| Валовая прибыль | 3740 | 2395 |
| Расходы на реализацию | - | - |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 3740 | 2395 |
| Операционные доходы | 389 | 237 |
| Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы | 39 | 6 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080 - 081) | 350 | 231 |
| Операционные расходы | 251 | 179 |
| Прочие операционные расходы | - | - |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от операционных доходов и расходов (090 - 100) | 99 | 52 |
| Внереализационные доходы | 376 | 41 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (130 - 131) | 376 | 34 |
| Внереализационные расходы | 1755 | 1204 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140 - 150) | -1379 | -1170 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2460 | 1277 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения | 3854 | 2472 |
| Налог на прибыль | 897 | 566 |
| Прочие налоги, сборы из прибыли | 116 | 154 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 1447 | 557 |

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ЯНВАРЯ 2012 ГОДА**

| АКТИВ | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| Основные средства | 8927 | 15279 |
| Нематериальные активы | 9 | 6 |
| Вложение во внеоборотные активы | 77 | 2121 |
| Запасы и затраты | 4273 | 8079 |
| Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам | 26 | 149 |
| Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты) | 176 | 244 |
| Расчеты с учредителями | - | - |
| Денежные средства | 755 | 968 |
| Финансовые вложения | 3 | 3 |
| Прочие оборотные активы | - | - |
| БАЛАНС | 14419 | 27007 |
| **ПАССИВ** | **На начало года** | **На конец отчетного периода** |
| Уставный фонд | 11305 | 11305 |
| Резервный фонд | 23 | 76 |
| Добавочный фонд | 1298 | 10368 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 159 | 457 |
| Целевое финансирование | - | - |
| Долгосрочные кредиты и займы | 114 | 105 |
| Краткосрочные кредиты и займы | - | - |
| Кредиторская задолженность | 1504 | 4564 |
| Задолженность перед учредителями | 16 | 132 |
| Резервы предстоящих расходов | - | - |
| БАЛАНС | 14419 | 27007 |

**Директор** *В.П. Зеленков* **Главный бухгалтер** *Е.П. Вертинская*

**Итоговая часть аудиторского заключения**

По нашему мнению, за исключением корректировок (при наличии таковых), которые могли бы оказаться необходимыми, если бы нами было проверено фактическое наличие товарно-материальных ценностей и иных активов и обязательств, бухгалтерская отчетность ОАО «Белэнергозащита», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Белэнергозащита» на 1 января 2012 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2011 год, при этом совершенные ОАО «Белэнергозащита» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству. Аудитор – общество с дополнительной ответственностью «ГрадМастерАудит», свидетельство о государственной регистрации выдано 6 мая 2010 года Минским горисполкомом и действительно до 18 мая 2015, УНП 191302282.


# Доктар, пацыент і... тэлевізар

## Сучасны погляд на звычныя праблемы

**108 мільярдаў рублёў прадугледжана сёлета інвестыцыйнай праграмай Гродзеншчыны на будаўніцтва і рэканструкцыю лячэбных устаноў і яшчэ 50 млрд руб. — на іх рамонт гаспадарчым спосабам. Пры гэтым стаўка робіцца на новыя медыцынскія тэхналогіі, паведаміў начальнік упраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Андрэй СТРЫЖАК.**

У красавіку на новай медыцынскай базе пачне працаваць абласная інфекцыйная бальніца. Пры гэтым, каб дакладна вызначыцца з дыягностыкай і лячэннем пацыента, ствараецца камп'ютарная база для сувязі з карпаратыўнай медыцынскай сеткай вобласці. Прадугледжаны і кансультацыі для раёнаў вобласці ў рэжыме анлайн. Сучасныя тэхналогіі выкарыстоўваюцца і ў сітуацыях з вострым каранарным сіндромам. Адзінай інфармацыйнай сістэмай аб'яднаны «хуткая дапамога», паліклінікі, гарадскія стацыянары і абласны кардыядыспансэр. Частка машын «хуткай дапамогі» ўжо аснашчана сістэмай тэлеЭКГ: урачы, якія прыехалі па выкліку, могуць неадкладна накіраваць кардыяграму ў дыспансэр і атрымаць кансультацыю спецыяліста. А калі спатрэбіцца, адразу ж перадаць пацыента ў рукі кардыяхірурга.

— У вобласці распрацавана праграма камп'ютарызацыі і стварэння лічбавых тэлемедыцынскіх сістэм, каб з дапамогай нашага партнёра — «Белтэлекама» — кожную раённую, гарадскую і абласную бальніцу падключыць да адзінай медыцынскай сеткі абмену інфармацыяй, — зазначае Андрэй Стрыжак. — І другая задача: шырокае ўкараненне медыцынскага кансультавання, так бы мовіць, па тэлевізары, каб мець аператыўную інфармацыю ў праблемных выпадках і хутка вызначыцца з лячэннем. Магчыма, трэба транспартаваць пацыента ў Гродна, альбо, праслаўшы рэанімацыйную брыгаду, даставіць яго ў рэспубліканскую клініку ў Мінск.

Цэнтр тэлемедыцынскага кансультавання, з якім можна звязацца медыкам з раёнаў, арганізаваны ў Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы. І доктару не трэба ехаць, дапусцім, у Астравец, каб пракансультаваць хворага. Можна ўбачыць яго па тэлевізары, паразмаўляць з ім, абмяняцца інфармацыяй з лечачым урачом, азнаёміцца з дыягнастычнымі даследаваннямі і параіць тактыку лячэння.

Акрамя таго, інфармацыя пра ўсіх пацыентаў, якія пабывалі ў абласной бальніцы, можа быць даступнай у раёнах. Зразумела, не для ўсеагульнага карыстання, а праз абароненую сістэму доступу. Раённы доктар заходзіць у банк звестак і бачыць, як пацыент абследаваўся і лячыўся на папярэднім этапе.

— Такое ж «кольца» цяпер будзем замыкаць па гарадскіх паліклініках і стацыянарах, — кажа Андрэй Стрыжак. — Праблема няпростая, затратная. І праграмісты патрэбны, і сур'ёзнае праграмнае забеспячэнне. Але гэтыя ўкладанні акупяцца.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


ОАО «Постторг» уведомляет кредиторов об уменьшении Уставного фонда до 1 541 070 000 (один миллиард пятьсот сорок один миллион семьдесят тысяч) белорусских рублей. Претензии принимаются в течение 30 дней с момента опубликования объявления.

**Администрация.**

*УНП 100036531*



МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Наталля.**

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў; **МАКСІМЕНКА С.А.**, старшыня Азярыцка-Слабадскога сельскага Савета дэпутатаў Смалявіцкага раёна.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 21 03;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 30.015. Нумар падпісаны ў 19.30 3 красавіка 2012 года.**

■ Кватэрнае пытанне

## ІЛЬГОТЫ ПРАДАСТАЎЛЯЮЦЦА АДЗІНОКІМ

***Мы з жонкай інваліды II групы, узрост за 80 гадоў, маем патрэбу ў пабочным доглядзе. Нашы дзеці жывуць і працуюць у Мінску, прапануюць пераехаць да іх. Калі мы гэта зробім, напішыце, ці будуць у нас ільготы на аплату жылля і камунальных паслуг?***

**П.Н.,** *Капыльскі раён.*

Згодна з падп. 3.13 арт. 16 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 чэрвеня 2007 г. № 239-З «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян», інваліды I і II групы (акрамя асоб, інваліднасць якіх надышла ў выніку супрацьпраўных дзеянняў, па прычыне алкагольнага, наркатычнага, таксічнага ап'янення, членашкодніцтва), якія не маюць працаздольных членаў сям'і, абавязаных згодна з законам іх утрымліваць, і пражываюць адны (або толькі з інвалідамі I або II групы і (або) з непрацуючымі пенсіянерамі, якія дасягнулі ўзросту, што дае права на пенсію па ўзросце на агульных падставах), маюць права на 50-працэнтную зніжку з платы за тэхнічнае абслугоўванне і (або) карыстанне жылым памяшканнем у межах 20 кв. метраў агульнай плошчы займаемага жылога памяшкання і права на 50-працэнтную зніжку з платы за камунальныя паслугі (гарачае і халоднае водазабеспячэнне, каналізацыя, газ, электрычная і цеплавая энергія, вываз і абясшкоджанне цвёрдых бытавых адходаў, карыстанне ліфтамі) па ўстаноўленых заканадаўствам тарыфах (стаўках) у межах зацверджаных нормаў спажывання.

Такім чынам, пры пражыванні бацькоў разам з працаздольнымі дзецьмі яны не будуць мець права на атрыманне льготы ў выглядзе 50-працэнтнай зніжкі з платы за тэхнічнае абслугоўванне і камунальныя паслугі.

**Віктар САВІЦКІ**

■ Прамая лінія газеты «Звязда» і радыёстанцыі «Мір»

# ПЕРАЯДАННЕ ЯК АДСУТНАСЦЬ ЛЮБОВІ ДА СЯБЕ

**Сумесна з радыёстанцыяй «Мір» наша газета правяла «прамую лінію» па тэме парушэнняў харчовых паводзін. Да такіх парушэнняў адносяцца нервовая анарэксія, нервовая булімія і пераяданне. Чаму ўзнікаюць гэтыя праблемы і як іх перамагчы? На пытанні карэспандэнтаў, а таксама слухачоў і чытачоў адказала ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога цэнтра памежных станаў Таццяна БАКШТАНОВІЧ.**



***Калі бабулі-матулі закармліваюць дзіця, кажуць, што лепш лопнуць, чым пакінуць ежу на талерцы, гэта, напэўна, ужо само па сабе фарміруе няправільныя харчовыя паводзіны. З другога боку, няправільна паводзяць сябе і тыя, хто пастаянна падлічвае калорыі і захапляецца дыетамі. Ці могуць такія моманты паспрыяць узнікненню парушэння харчовых паводзін?***

— Безумоўна. Няправільныя ўстаноўкі, закладзеныя нашымі бацькамі, з'яўляюцца тым падмуркам, на якім потым і фарміруецца праблема. Нельга закармліваць дзяцей, прымушаць іх есці... З другога боку, парушэнні харчовых паводзін — гэта не проста хваробы. Нервовая анарэксія і нервовая булімія — захворванні псіхічныя, якія патрабуюць спецыфічнага лячэння. Тая ж анарэксія лечыцца на пачатковым этапе, пры выражаных праявах захворвання ў спецыялізаваным стацыянары. Бо мы маем справу з вельмі сур'ёзным захворваннем, якое можа завяршыцца гібеллю пацыента.

***Як жа праяўляюцца анарэксія і булімія?***

— Хворыя на нервовую анарэксію — гэта, як правіла, дзяўчаты ад 12 да 24-30 гадоў. Пакутаваць ад гэтага расстройства могуць і хлопцы, але такое здараецца значна радзей. Выявіць анарэксічнага пацыента на раннім этапе захворвання не так і проста. Таму што хворыя ўсяляк утойваюць ад навакольных той факт, што не ўжываюць ежу, імкнуцца выкідваць яе, не садзяцца есці за агульны стол, не наведваюць установы грамадскага харчавання. Самому хвораму такія паводзіны здаюцца нармальнымі, а таму ён не спяшаецца прасіць аб дапамозе. Але аднойчы праблема становіцца відавочнай — надыходзіць істотная страта вагі.

Падчас пастаноўкі дыягназу першае, што вызначае спецыяліст, — менавіта значнае зніжэнне масы цела. Другі важны момант — наяўнасць у хворай неабгрунтаванага страху перад залішняй вагой. Гэта пры тым, што звычайна ў такіх пацыентак ніколі не было лішняй вагі, яна была нармальнай або вельмі блізкай да нормы. І што характэрна, чым ніжэй маса цела, тым вышэй можа быць трывога адносна магчымай папраўкі. Яшчэ адзін момант — аменарэя, адсутнасць месячных на працягу трох і больш месяцаў.

Нервовая булімія таксама характэрная больш для маладога ўзросту — максімум да 30 гадоў. Сустракаецца гэтае захворванне, дарэчы, часцей, чым анарэксія. Вызначаецца прыступамі невераготнага голаду, калі за кароткі час хворы спустошвае халадзільнік, паглынае вельмі вялікую колькасць ежы, прычым менавіта тых прадуктаў, якія лічыць для сябе забароненымі. Як правіла, гэта лёгказасваяльныя вугляводы. Кантраляваць прыступ голаду немагчыма, а таму немагчыма і спыніцца. І ўсё ж такі калі прыпынак надыходзіць, то з ім надыходзіць і пачуццё віны. Як яго пазбавіцца? З дапамогай штучна выкліканых ванітаў, прымянення паслабляльных сродкаў, ачышчальных клізмаў. Для спецыяліста пры пастаноўцы дыягназу важна, каб такія прыступы мелі месца не менш за 2 разы на тыдні на працягу дзесьці 3 месяцаў. Булімію, дарэчы, выявіць яшчэ цяжэй, чым анарэксію, паколькі ў такіх хворых, як правіла, захоўваецца вага, нярэдка яны з'яўляюцца сацыяльна паспяховымі асобамі...

***Што ўсё ж такі прымушае людзей так жорстка абыходзіцца з сабой?***

— Лічыцца, што да нервовай анарэксіі прыводзіць не адна, пэўная, а некалькі прычын. Гэта генетычная схільнасць, псіхалагічны аспект — канфлікт з кімсьці або з самім сабой, нізкая самаацэнка, пастаянна зніжаны настрой, нарэшце, сацыяльны фактар — эталон прыгажосці «лялькі Барбі», навязаны грамадству яшчэ ў 80-х. Дакладныя прычыны буліміі не ўстаноўлены, аднак вядома, што для падобных адхіленняў характэрная занепакоенасць уласнай вагой, неадэкватнае ўспрыманне свайго цела.

***Куды могуць звяртацца бацькі хворых і самі хворыя?***

— Той, хто пражывае ў Мінску, можа звяртацца адразу ў наш Гарадскі цэнтр памежных станаў. Для іншагародніх кансультаванне ажыццяўляецца на платнай аснове. Можна звяртацца і да спецыялістаў РНПЦ псіхічнага здароўя. У гэтым цэнтры ёсць выдатныя напрацоўкі лячэння пацыентаў з анарэксіяй. Тут праводзіцца карэкцыя саматычных станаў, аднаўленне вагі, вядзецца псіхатэрапія, скіраваная на аднаўленне міжасабовага ўзаемадзеяння. Праводзіцца і сямейная псіхатэрапія. Булімія, як правіла, лечыцца амбулаторна...

У маёй практыцы былі выпадкі, калі прыходзілі самі дзяўчаты з заявамі аб сваіх падазрэннях. Як правіла, пэўныя здагадкі пра анарэксію ў іх нараджаліся пасля азнаямлення з адпаведнымі артыкуламі ў часопісах або пасля прагляду тэлеперадач па гэтай тэме. Звычайна ж прыйсці да спецыяліста хворую прымушаюць праблемы са здароўем — з'яўленне непадкантрольных ванітаў, адчуванне дэпрэсіўнага расстройства, выпадзенне валасоў, высыханне скуры, ламанне пазногцяў.

***ЗВЯЗДА Адносна пераядання, напэўна, нельга вылучыць пэўны ўзрост. Праблема можа ўзнікнуць як у дзяцей, так і ў любога дарослага чалавека...***

— Сапраўды, значэнне тут маюць спадчыннасць, асаблівасці канстытуцыі, наяўнасць эндакрынных хвароб (хоць лічыцца, што толькі 5 працэнтаў выпадкаў атлусцення звязаны менавіта з эндакрыннай паталогіяй), малярухомы лад жыцця, лад харчавання. Аднак самае важнае — усё тыя ж псіхалагічныя праблемы і няўменне іх вырашаць. Гэтую сітуацыю мы называем «заяданнем стрэсу». Прычынай жа стрэсу найчасцей становіцца страта аб'екта кахання — смерць блізкага чалавека, развітанне з партнёрам, сыход у дарослае жыццё дзяцей... Другая група найбольш частых прычын звязана з хранічным напружаннем, пачуццём пустэчы і трывогі. Людзі з павышанай масай цела маюць вельмі высокую трывожнасць, і пераяданне з'яўляецца рэакцыяй на гэтую трывогу, на негатыўныя сітуацыі і страхі. Ежа служыць суцішэннем за адсутнасць любові да сябе. Наогул у кожнага пацыента ёсць свой, індывідуальны псіхалагічны фактар, які абумоўлівае пераяданне.

***ЗВЯЗДА З чаго ў такім выпадку пачынаецца абследаванне?***

— Праводзіцца клінічнае інтэрв'ю — апытанне. Важна высветліць, як з'явілася праблема, што адбывалася ў дзяцінстве, пры якіх сітуацыях чалавек папраўляецца, а пры якіх страчвае вагу, — словам, гэта вельмі падрабязнае апытанне. Далей вынікі аналізуюцца ўрачом-псіхатэрапеўтам і падбіраецца адпаведная псіхатэрапеўтычная методыка. Метадаў псіхатэрапіі, якія прымяняюцца ў такіх выпадках, даволі шмат. Шырокае прымяненне мае, напрыклад, паводзінавая псіхатэрапія, калі мяняюцца стэрэатыпы паводзін. Хворага матывуюць на новае стаўленне да ежы, фізічнай нагрузкі і г.д. Чаму ўсе дыеты дэманструюць нізкую эфектыўнасць? Таму што яны не ўлічваюць псіхалагічныя асаблівасці пацыента. Там ёсць толькі строгае абмежаванне тых ці іншых прадуктаў. Аднак бывае, што для пацыента ежа — ледзь ці не адзінае задавальненне ў жыцці, а мы з дапамогай выключна дыеты спрабуем пазбавіць яго гэтага задавальнення. Некаторым прасцей мець лішнюю вагу, чым разбірацца ў псіхалагічных праблемах. Без матывацыі нічога не будзе. Матывы будуць ва ўсіх рознымі, але ў любым выпадку размова будзе ісці аб тым, што за правільныя харчовыя паводзіны мы павінны атрымліваць нейкія бонусы, заахвочванне.

***ЗВЯЗДА Але ж вы арыентуеце пацыента на перамены ў харчаванні?***

— Так, і пачынаецца гэтая работа з вядзення харчовага дзённіка. Пацыенты часта кажуць, што «многа не ядуць». І толькі дзённік не пакідае шанцаў жыць самападманам, паколькі звычайна аказваецца, што пацыент спажывае не так і мала... Мы, зразумела, расказваем, што ўжываць ежу нельга падчас прагляду тэлеперадач — толькі за сталом, у пэўныя гадзіны, са сталовымі прыборамі. Навучаем і кантролю за спажываннем ежы: з'еў тры кавалачкі — адкладзі відэлец, дасканала пережуй. За гэты час чалавек паспявае ацаніць тое, што з'еў.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

***(Працяг будзе.)***

■ Ну і ну!

## ПАД ДУЛАМ ПІСТАЛЕТА

Дула пісталета ў твар і рытарычнае пытанне «Жыццё або грошы?» для таваразнаўцы брэсцкага ламбарда «Вега-Прым Брэст» аказаліся не кадрамі з кінафільма, а рэальнымі падзеямі, у якіх галоўная адмоўная роля належала 20-гадовай мясцовай жыхарцы. Налётчыца хутка схапіла 575 тысяч беларускіх рублёў і ўцякла на вуліцу. Балазе, работніца ламбарда, выкладваючы выручку, аднвачасова націснула кропку трывожнай сігналізацыі. Бліжэй за ўсіх да месца злачынства аказаўся міліцыянер Ленінскага аддзела Дэпартамента аховы Вячаслаў Хіль, які нёс службу на пасту па ахове суда Брэсцкага раёна. Хлопец выскачыў на вуліцу і заўважыў у натоўпе апранутую ў светлую куртку дзяўчыну, якая хутка ішла і хавала твар. Калі міліцыянер яе аклікнуў, маладая асоба толькі паскорыла крок і паспрабавала ўцячы. Сумненняў, што гэта і ёсць налётчыца, не засталося. Прапаршчык дагнаў яе і перадаў нараду групы затрымання аддзела аховы, які падаспеў своечасова. Прыбыўшы на месца здарэння, дырэктар ламбарда Юрый Бянасік доўга дзякаваў супрацоўнікам аховы за аператыўныя і прафесійныя дзеянні.

Аднак на гэтым гісторыя не скончылася. Пры асабістым аглядзе ў брастаўчанкі, акрамя скрадзеных грошай і дзіцячага пластмасавага пісталета, быў знойдзены кашалёк з мільёнам беларускіх рублёў і дзвюма пластыкавымі карткамі. Высветлілася, што за дзве гадзіны да нападу на ламбард паненка «папрацавала» ў гандлёвым цэнтры «Нікольскі», «абчысціўшы» індывідуальную прадпрымальніцу. У міліцыі пацярпелая апазнала і кашалёк, і зладзейку. Цяпер у дачыненні да падазронай заведзены дзве крымінальныя справы.

**Наталля СВІДУНОВІЧ, прэс-служба Дэпартамента аховы МУС**


**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**
**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревне Вызволенье, деревне Пекалин, агрогородке Слобода, деревне Шабуни Пекалинского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2. | **Дата, время и место проведения аукциона** | 4 мая 2012 года, в 15.00, д. Пекалин, ул Ленина, 34, Пекалинский сельисполком, зал заседаний |
| 3. | **Продавец и его адрес** | Пекалинский сельисполком , д. Пекалин, ул Ленина, 34 |
| 4. | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 — площадь 0,15 га, № 624883601601000071 д. Вызволенье;<br>Лот № 2 — площадь 0,2033 га, № 624883603601000235 д. Пекалин;<br>Лот № 3 — площадь 0,1482 га, № 624883604601000389 аг. Слобода, ул. Центральная;<br>Лот № 4 — площадь 0,1394 га, № 624883606601000110 д. Шабуни |
| 5. | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6. | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7. | **Начальная (стартовая) цена** | Лот № 1 — 11777205 рублей<br>Лот № 2 — 64014600 рублей<br>Лот № 3 — 37166400 рублей<br>Лот № 4 — 12484664 рубля |
| 8. | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной,<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9. | **Наличие инженерной инфраструктуры** | д. Вызволенье — электроснабжение;<br>д. Пекалин, ул. Приозерная — электроснабжение, водоснабжение, водоотведение, газоснабжение;<br>аг. Слобода, ул. Центральная — электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение, асфальтированный подъезд,<br>д. Шабуни — электроснабжение |
| 10. | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11. | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3600627070008 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал № 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04901 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12. | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | Каждая среда в 12.00 |
| 13. | **Окончательный срок приема документов** | 27 апреля 2012 года в 17.00 |
| 14. | **Контактные телефоны** | 8 01776 61 624, 61 634, Vel 314 43 01 |

Расходы по организации и проведению аукциона (лот № 1 — 1779341, № 2 — 1691389, № 3 — 1691389 рублей, лот № 4 — 2468316), затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.

3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).


# ПАДЫХОДЫ ДА ПРЫЗНАЧЭННЯ І ВЫПЛАТЫ ДАПАМОГ МАЦІ-АДЗІНОЧКАМ БУДУЦЬ ЗМЕНЕНЫ

**Нядаўна прайшла чарговая online-канферэнцыя сумеснага праекта Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі і БЕЛТА на тэму «Дзяржаўная сацыяльная падтрымка насельніцтва». На вашы пытанні адказалі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціна КАРАЛЁВА і спецыялісты міністэрства.**

### Штогод у сярэднім 224 жанчынам пасля правядзення аперацыі па выдаленні малочнай залозы даецца III група інваліднасці

*Марыя Пуневіч, Магілёў: У пералік тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, на набыццё якіх прадастаўляецца дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога (ДАСД), уносіцца новы сродак рэабілітацыі — пратэз малочнай залозы з ліфамі для жанчын, якія маюць 3 групу інваліднасці пасля перанесенай аперацыі па выдаленні малочнай залозы. Колькі жанчын у сярэднім у год пасля правядзення такой аперацыі атрымліваюць 3 групу інваліднасці? На які тэрмін выдаецца такі пратэз жанчыне і ў якім парадку магчымая яго замена?*

**Намеснік начальніка ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва, начальнік аддзела па справах інвалідаў Рыта СУШКО:** Па інфармацыі Міністэрства аховы здароўя, у сярэднім за год 224 жанчынам пасля правядзення аперацыі па выдаленні малочнай залозы даецца III група інваліднасці. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе» сацыяльная дапамога на аплату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі прадастаўляецца на перыяд эксплуатацыі сродкаў рэабілітацыі: пратэз малочнай залозы — адзін год, ліфы — 6 месяцаў (дапускаецца аднвачасова выдача двух ліфаў). Звяртаем вашу ўвагу, што сацыяльная дапамога на аплату пратэза малочнай залозы з ліфамі будзе прадастаўляцца з 1 красавіка 2012 года.

### Падыходы да прызначэння і выплаты дапамог маці-адзіночкам будуць зменены

*Жаркова М.З., г.Ліда: Ці плануецца падкарэктаваць парадак аказання дзяржпадтрымкі маці-адзіночкам (маю на ўвазе тых, хто фактычна знаходзіцца ў шлюбе, але не рэгіструе яго ў органах ЗАГС для атрымання пэўных ільгот)? Дарэчы, наколькі яны значныя?*

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Валянціна КАРАЛЁВА:** Зараз распрацоўваецца праект закона, які прадугледжвае выкладанне Закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» у новай рэдакцыі. У законапраекце прадугледжваецца комплекснае змяненне падыходаў да прызначэння і выплаты дапамог, у тым ліку для такой катэгорыі сем'яў. Паводле дзейнага закона адзінокія маці маюць права на надбаўкі да дапамог: у памеры 75% — пакуль дзіцяці не споўніцца 1,5 года, у памеры 40% — на дзяцей старэйшых за 1,5 года.

*Ганна, Мінск: Падкажыце, ці зменіцца памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у адзінокай маці, калі яна выйдзе замуж?*

**Начальнік аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Марына АРЦЁМЕНКА:** У адпаведнасці з арт. 23 Закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» на дзяцей, народжаных жанчынамі па-за шлюбам, калі звесткі пра бацьку дзіцяці ў запісе акта аб нараджэнні зроблены па ўказанні маці, прызначаецца і выплачваецца штомесячная надбаўка да дзяржаўнай дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Яе памер на кожнае дзіця складае 75 % ад дапамогі, пакуль дзіцяці не споўніцца 1,5 года, і 40 % ад дапамогі на дзіця ва ўзросце ад 1,5 да 3 гадоў.

Выплата названай надбаўкі спыняецца ў выпадку ўступлення жанчыны ў шлюб альбо сумеснага пражывання і вядзення агульнай гаспадаркі з асобай, якая не знаходзіцца з ёй у зарэгістраваным шлюбе. Пры ўзнікненні абставін, якія маюць вынікам спыненне выплаты надбаўкі да дапамогі, яе выплата спыняецца: па месцы працы (службы), вучобы атрымальніка — з дня ўзнікнення названых абставін; у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне — з месяца, наступнага за месяцам узнікнення названых абставін.

### Адкрыццё сумесных дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў і састарэлых грамадзян не плануецца

*Алена Трусава, Мінск: Ці плануецца ў Беларусі адкрываць сумесныя дамы-інтэрнаты — для дзяцей-сірот, дзяцей-інвалідаў і старых? На думку псіхолагаў, гэта было б разумным рашэннем ...*

**Валянціна Каралёва:** Адкрыццё ў Беларусі ў бліжэйшы час сумесных дамоў-інтэрнатаў для дзяцей-інвалідаў і састарэлых грамадзян не плануецца.

*Галіна Мірская, Магілёў: Ці атрымалася вырашыць праблему чэргаў на пасяленне ў дамы-інтэрнаты для пажылых людзей?*

**Валянціна Каралёва:** Праца па аптымізацыі чарговасці на пасяленне ў дамы-інтэрнаты вядзецца пастаянна. Рэалізацыя Праграмы развіцця і аптымізацыі сеткі ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання да 2011 года ў Рэспубліцы Беларусь дазволіла:

- стварыць у дамах-інтэрнатах 1338 месцаў;

- прывесці плошчы спальных памяшканняў да ўстаноўленых санітарнымі нормамі (7 $м^2$ на чалавека) у 12-ці дамах-інтэрнатах з 17-ці (у Брэсцкай — у 4-х дамах-інтэрнатах, Гродзенскай — у 4-х, Гомельскай — у 2-х, Мінскай — у 2-х).

У 2011 годзе адкрыты 2 дамы-інтэрнаты ў г. Гомелі і г. Клецку.

Усяго па стане на 2011/11/01 г. налічваецца 76 дамоў-інтэрнатаў. На працягу 2012—2015 гадоў плануецца стварыць 1305 месцаў.

Чарговасць на пасяленне ў дамы-інтэрнаты па стане на 01.01.2012 складае 592 чал. Праблема чарговасці для пасялення ў дамы-інтэрнаты актуальная толькі для некаторых рэгіёнаў рэспублікі. У першую чаргу для г. Мінска, дзе чарговасць на пасяленне ў інтэрнатныя ўстановы складае 420 чалавек, і Віцебскай вобласці — 172 чалавекі. На працягу 2012 года плануецца стварэнне 535 месцаў.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

# «ВЫТВОРЧАСЦЬ МАЛАКА ЧАСОВА СПЫНЕНА З-ЗА ВЫСОКАЙ СТРАТНАСЦІ»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**Чытачка з вёскі Касута Вілейскага раёна паведаміла па нашай «гарачай лініі», што яшчэ нядаўна (хоць і не без пэўных цяжкасцяў) можна было набыць у крамах малочныя прадукты з нізкай тлустасцю. Прынамсі, іх завозілі зранку. З пазамінулай суботы, зазначыла заяўніца, тое ж малако прадаецца з мінімальнай тлустасцю 3,6 працэнта. Па словах прадаўцоў, так званая сацыяльная «малочка» быццам бы знята з вытворчасці. І цяпер у продажы зусім няма малака з тлустасцю 3,2-3,5 працэнта, не кажучы ўжо пра прадукты з тлустасцю 1-1,5 працэнта. «А калі каму ўрачы забараняюць ужываць у ежу тлустыя прадукты, што тады рабіць?» Акрамя таго, акцэнтавала ўвагу чытачка, калі пакет малака тлустасцю 3,5 працэнта каштаваў 2 360 рублёў, дык прадукт тлустасцю 3,6 працэнта — ужо 4 700 рублёў.**

Паколькі гаворка ішла пра тавары Маладзечанскага малочнага камбіната, рэдакцыя звярнулася да кіраўніцтва апошняга з просьбай патлумачыць сітуацыю з вытворчасцю і рэалізацыяй прадпрыемствам малочнай прадукцыі з нізкім утрыманнем тлушчу. Вось які адказ «Звязда» атрымала неўзабаве.

«ААТ «Маладзечанскі малочны камбінат» сёння пастаўляе ў гандлёвую сетку рэгіёна малочную прадукцыю ў наступным асартыменце: малако фін-пак (у плёнцы — **С.Р.**) 1 літр тлустасцю 3,5 працэнта з ёдаваным бялком, тлустасцю 3,6 працэнта; пюр-пак (у каробцы — **С.Р.**), 1 літр, 3,5 працэнта тлустасці з вітамінам «С»; пюр-пак, 0,5 літра, 1,5 працэнта тлустасці, узбагачанае харчовымі валокнамі; смятану 12-працэнтнай тлустасці, узбагачаную харчовымі валокнамі, 250 грамаў; 20-працэнтнай тлустасці, узбагачаную кальцыем, 250 грамаў; смятану 26-працэнтнай тлустасці, 0,5 літра; біякефір 1,5-працэнтнай тлустасці, 0,5 літра; кефір 3,2-працэнтнай тлустасці, ёдаваны, 1літр; біякефір 3,2-працэнтай тлустасці, фасаваны па 1 літры, 0,5 літра, 0,2 літра; біятварог абястлушчаны, упакаваны. Зыходзячы з плана вытворчасці, замовы спажыўцоў забяспечваюцца ў поўным аб'ёме.

Вытворчасць малака 3,2 і 3,5-працэнтнай тлустасці ў плёнцы часова спынена з-за высокай стратнасці вытворчасці. Рэнтабельнасць малака 3,2-працэнтнай тлустасці (1 літр) складае мінус 58,2 працэнта, малака 3,5-працэнтнай тлустасці — мінус 57,1 працэнта, «дарагога» малака 3,6-працэнтнай тлустасці — мінус 14,9 працэнта. Прадукцыя адносіцца да сацыяльна значнай, цэны на якую ўстаноўлены ў верасні 2011 года (пастанова Мінэканомікі ад 19.09.2011 №153), яны не толькі не забяспечваюць рэнтабельнасць вытворчасці, але не пакрываюць нават кошту малака, што закупліваецца. Сярэдняя цана такога малака ў сакавіку — 2 789 рублёў».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**Годовой отчет эмитента ценных бумаг ОАО «Рапс»**
*223014 Минский район д. Крупица*
**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2012 г.** *Млн руб.*

| № п/п | Наименование показателя | Код строки | На начало года | На конец года |
|---|---|---|---|---|
| | **Актив** | | | |
| 1 | Внеоборотные активы | 190 | 56971 | 103977 |
| 2 | Оборотные активы | 290 | 31066 | 45721 |
| | **Баланс** | 300 | 88037 | 149698 |
| | **Пассив** | | | |
| 3 | Капитал и резервы | 490 | 45341 | 105700 |
| 4 | Обязательства | 590 | 42696 | 43998 |
| 5 | Баланс | 600 | 88037 | 149698 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2011 г. (млн руб.)**

| № п/п | Наименование показателя | Код строки | За отчетный год | За прошлый год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Выручка от реализации продукции без налогов | 020 | 101828 | 52041 |
| 2 | Себестоимость реализованной продукции, работ и услуг | 030 | 79334 | 48135 |
| 3 | Расходы на реализацию | 050 | 77 | 83 |
| 4 | Прибыль (убыток) от реализации | 060 | 22417 | 3823 |
| 5 | Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 120 | -1165 | -1106 |
| 6 | Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | 160 | -1246 | 1234 |
| 7 | Прибыль (убыток) отчетного года | 200 | 20006 | 3951 |
| 8 | Налоги и сборы из прибыли | 210 | 8 | 7 |
| 9 | Расходы и платежи из прибыли | 220 | | |
| 10 | Прибыль (убыток) к распределению | 240 | 19998 | 3944 |

Финансовые показатели подтверждены аудиторской проверкой (положительное аудиторское заключение).

Срок выплаты дивидендов за 2011 г. — с 1 апреля 2012 г. по 1 июля 2012 г.

Порядок выплаты дивидендов:

– работающим и неработающим акционерам – по ведомостям в кассе Общества;

– по заявлениям акционеров – почтовым переводом или перечислением на лицевой счет в АСБ «Беларусбанк».

**Директор** **Ломако М.С.**
**Гл. бухгалтер** **Побудей Н.В.**

*УНП 600068480*



**Поплавский сельский исполнительный комитет**
**Березинского района Минской области (далее Продавец)**
**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**
**по продаже 2 (двух) земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Красный Берег:**

| № | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Березинский район д. Красный Берег, ул. Центральная, 23Б 620484305601000192 | 0,1426 | электроснабжение | 3769350 | 376940 |
| 2. | Березинский район д. Красный Берег, ул. Тенистая, 8А 620484305601000193 | 0,2021 | электроснабжение | 5342110 | 534210 |

*** Примечание: земельный участок лот № 1 имеет ограничения в использовании земель в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Березина, земельный участок лот № 2 имеет ограничения в использовании земель в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Поплавка.**

Задаток перечисляется на р/с № 3604060201881 в ЦБУ № 602 ф-ла № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Борисова код 810, УНН 600036561, ОКПО 04431843.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельным участком.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится 4 мая 2012 года в 10.00 по адресу: Березинский район, д. Поплавы, Поплавский сельский Совет (зал заседаний).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются ежедневно (кроме воскресенья) до 17.00 (в субботу до 13.00) по адресу: **д. Поплавы Березинского района Минской области, Поплавский сельский Совет (кабинет № 3).**

Прием заявлений заканчивается не позднее чем за три рабочих дня до начала проведения аукциона.

**Контактный телефон: (8 01715) 48 245**


## БАЦЬКІ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ СТАНУЦЬ БЛІЖЭЙ

### ...дамоў можна будзе ездзіць у любы дзень тыдня

**Атрымаць матэрыяльную кампенсацыю за паездку дамоў да бацькоў іншагароднія студэнты і навучэнцы змогуць цяпер нават у тым выпадку, калі яны выправіліся ў дарогу ў пятніцу, а вярнуліся на заняткі ў панядзелак. Новы парадак прадастаўлення навучэнскай моладзі матэрыяльнай дапамогі на праезд дамоў зацверджаны Пастановай Савета Міністраў ад 28 сакавіка 2012 года № 274.**

Згодна з новым парадкам, матэрыяльная кампенсацыя будзе выплачвацца іншагароднім навучэнцам і студэнтам за паездкі, здзейсненыя ў любы дзень тыдня, у перыяд з 1 верасня па 30 чэрвеня. Варта нагадаць, што раней студэнты маглі прэтэндаваць на частковую кампенсацыю за праезд толькі ў тым выпадку, калі яны здзяйснялі паездку ў выхадныя ці святочныя дні. Але як у такім разе можна было і адпачыць, і дапамагчы сваім бацькам?

Згодна з пастановай урада, матэрыяльная дапамога на праезд можа аказвацца навучэнцам і студэнтам у выглядзе частковай кампенсацыі (не больш як 50%) кошту праезду да месца пражывання сям'і (бацькоў). На пасажырскім транспарце агульнага карыстання рэгулярных міжгародных зносін кампенсуюцца не больш чым дзве паездкі за месяц (туды і назад), а на прыгарадным транспарце — не больш як чатыры паездкі за месяц (туды і назад).

Матэрыяльная дапамога можа аказвацца студэнтам і навучэнцам пры ўмове, калі сярэднедушавы даход іх сям'і ніжэйшы за найбольшую велічыню бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага ўрадам за два апошнія кварталы. Выплата матэрыяльнай дапамогі распаўсюджваецца на іншагародніх студэнтаў і навучэнцаў дзённых аддзяленняў устаноў дзяржаўнай формы ўласнасці. Рашэнне аб аказанні матэрыяльнай дапамогі на праезд, а таксама аб яе памеры прымаецца пастаянна дзейнай камісіяй па аказанні матэрыяльнай дапамогі на праезд. Такія камісіі створаны ў кожнай навучальнай установе.

## СТУДЭНЦКІЯ ІНТЭРНАТЫ ПАДАРАЖЭЮЦЬ НЯЗНАЧНА

**Памер платы за карыстанне інтэрнатамі для студэнтаў і навучэнцаў з 1 красавіка істотна не зменіцца. Такое рашэнне змяшчаецца ў Пастанове Савета Міністраў № 281 ад 29 сакавіка 2012 года.**

Нагадаем, што ў кастрычніку 2011 года ўсе студэнцкія інтэрнаты былі падзелены на тры катэгорыі. Самым дарагім для студэнцкай моладзі стала пражыванне ў інтэрнатах першай катэгорыі. За камфорт студэнты павінны былі плаціць штомесяц тры базавыя велічыні, або 105 тысяч рублёў на той момант. Кошт пражывання ў інтэрнаце другой катэгорыі склаў дзве базавыя велічыні (70 тысяч рублёў) і адну базавую велічыню (35 тысяч рублёў) — у інтэрнаце трэцяй катэгорыі. Аднак у сувязі з ростам з 1 красавіка базавай велічыні амаль утрая плата за пражыванне ў студэнцкіх інтэрнатах таксама магла істотна ўзрасці. Таму з мэтай сацыяльнай абароны навучэнскай моладзі ўрадам было прынята рашэнне аб змяншэнні кратнасці базавай велічыні, ад якой залежыць памер платы за карыстанне інтэрнатам.

Згодна з Пастановай Савета Міністраў, для студэнтаў ВНУ памер платы за пражыванне ў інтэрнатах павялічыцца толькі на 14 працэнтаў. У інтэрнатах першай катэгорыі ён складзе 1,2 базавай велічыні (120 тысяч рублёў), у інтэрнатах другой катэгорыі — 0,8 базавых велічынь (80 тысяч рублёў) і трэцяй катэгорыі — 0,4 базавыя велічыні (40 тысяч рублёў).

Для навучэнцаў прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў плата за пражыванне ў інтэрнатах складзе 0,16 базавай велічыні, або 16 тысяч рублёў, а для навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў — 0,28 базавай велічыні, або 28 тысяч рублёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**У суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобл.** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Лісавай (Бурлачэнкі) Валянціны Уладзіміраўны**, 23 сакавіка 1978 года нараджэння, ураджэнкі г. Рэчыца Гомельскай вобл., апошняе месца жыхарства: г. Рэчыца, вул. Навумава, д. 24, кв. 21, Гомельскай вобл. Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Лісаву (Бурлачэнку) Валянціну Уладзіміраўну, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі на адрас: г. Рэчыца, вул. Леніна, 49.


**Утерянный паспорт транспортного средства ТГ № 007529,** выданный 19.03.2012 г. на автомобиль МАЗ-544008, **считать недействительным.**

■ Жыццёвыя гісторыі

# ЯЕ СЯМ'Я

**Студэнтка, мастачка, проста прыгажуня... Усё гэта і шмат чаго яшчэ пра яе, пра Насцю Чорную з вёскі Занарач Мядзельскага раёна. Хаця, можа, лепш напісаць, што дзяўчына з Расіі, з Хабараўска, дзе яна нарадзілася? Ці з Жодзіна, дзе жыла і вучылася ў дзіцячым доме і школе-інтэрнаце? Ці з Мінска, бо Насця цяпер студэнтка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта? Вазьму на сябе смеласць сказаць, што самае першае сцвярджэнне — самае вернае. Яе радзіма на Мядзельшчыне, там, дзе жыве яе сям'я: маці, тата, браты і сёстры. У дзіцячым доме сямейнага тыпу.**



## МАРЫ ПРА МОРА

Беларускае грамадзянства 18-гадовая дзяўчына атрымала два гады таму, калі рабіла свой першы ў жыцці «дарослы» пашпарт. «Я з-за таго, што раней у мяне было расійскае грамадзянства, нават не магла патрапіць да замежных сяброў, на мора. Мае знаёмыя з дзіцячага дома ездзілі за мяжу, некаторых нават усынаўлялі, а я і на лета не магла ў госці паехаць. А я так хацела ўбачыць мора!» — расказвае дзяўчына.

У яе адкрытая ўсмешка і ясныя вочы. На моры Насця пакуль не была. Затое расла на беразе беларускай «жамчужыны» — возера Нарач — у вялікай сям'і: маці Жанна Станіславаўна Кавальская, бацька Пётр Дзмітрыевіч Івашчук, двое сваіх дзяцей, восем прыёмных. Хаця (Насця адчувала гэта заўсёды) тут усе былі свае — Яраслава, Арцём, Павел, Андрэй, сама Насця, Паліна, Улад, Максім, Каця, Ігар. Цяпер у сямейным дзіцячым доме пяцёра новенькіх — Ваня, Юра, Вераніка, яшчэ адна Насця, Мікіта. Амаль кожныя выхадныя Насця Чорная прыязджае ў сваю сям'ю ў вёску Занарач, дзе яе чакае сапраўднае мора. Мора любові і добразычлівасці, пяшчоты і разумення.

Хаця нарадзілася Насця, як я ўжо ўзгадвала, у Хабараўску. У пяцігадовым узросце трапіла ў Жодзінскі дзіцячы дом, потым у школу-інтэрнат, што размяшчалася па суседстве. Больш ранні перыяд жыцця яна не памятае. Ці не хоча ўспамінаць... Узгадвае толькі, што родныя бацькі вельмі моцна яе каралі. Ведае, што «тая маці» жыве таксама ў Беларусі, але апошні раз бачыла яе, калі вучылася ў першым класе, і больш бачыць не хоча. Бацька памёр, малодшага Насцінага брата ўсынавілі, і ў яго цяпер іншае прозвішча. Са старэйшай сястрой нейкія сувязі ёсць. «Яна да мяне ў дзіцячы дом прыходзіла са школы-інтэрната, гасцінцы прыносіла», — узгадвае дзяўчына. Але назваць гэтых людзей адной сям'ёй, мабыць, ужо і нельга.

«Цяпер мая маці — Жанна Станіславаўна, — кажа Насця. — Хто ведае, што было б са мной, каб не яна»? Так, гэтага ніхто не ведае. Лёс у пакінутых дзяцей далёка не заўсёды складваецца шчасліва. Яны ж толькі дзеці. Сустрэнуцца ў жыцці такога хлопчыка ці дзяўчынку сапраўдныя, не па крыві, а па душы, мама і тата — лічы, пашанцавала. Настассі, бясспрэчна, пашанцавала, але першы крок да сваёй сапраўднай сям'і яна зрабіла сама, калі яшчэ вучылася ў пятым класе.

## ЛІСТ ДА МАЦІ

Выхаванка школы-інтэрната была заўсёды надзвычай актыўнай, удзельнічала ў шматлікіх конкурсах. Напрыклад, некалькі гадоў запар была ўдзельніцай конкурсу для дзяўчынак, назву якога Насця ўжо не памятае. Затое яна не забылася, як перажывала на сваім першым конкурсе: і словы кудысьці зніклі, і танец з элементамі акрабатыкі не атрымаўся. Але паступова асвоілася, на сцэну выходзіла ўсё часцей. А пасля пачатковай школы Насця трапіла ў кадэцкі клас, дзе з двацццаці вучняў было толькі тры дзяўчынкі. Дысцыпліна там была сапраўды ваенная: ранняя пад'ёмы, прабежкі, самастойнае штодзённае прыбіранне памяшканняў. Як кажа сама дзяўчына, тады ёй падавалася, што дарослыя проста здзекуюцца з дзяцей, але пазней зразумела: усё ідзе да лепшага. Так трэба было, каб стаць адказным і пунктуальным чалавекам.

Праўда, у кадэцкім класе заставалася Насця нядоўга. Пра сямейны дзіцячы дом Жанны Станіславаўны Кавальскай ведала, чула толькі добрае, ды яшчэ сяброўка са школы-інтэрната правяла лета ў гэтай сям'і. І Насця асмелілася: напісала ліст да маці. Усіх слоў не памятае, але адна фраза запомнілася. «Я буду вам добрай дачкой», — напісала маленькая дзяўчынка незнаёмай жанчыне. Тыдні праз два прыйшоў адказ: Насцю запрашалі ў Занарач на лета. Яна, зразумела, паехала. Прычым, збіраючыся толькі на канікулы, сабрала ўсе свае рэчы, развіталася з усімі сябрамі і знаёмымі. А калі ў жніўні мама Жанна спытала: «Ну што, застаешся?» — толькі шчасліва кіўнула галавой.

Дарэчы, да сям'і, як і сям'я да Насці, прывыкла хутка. «Я Жанне Станіславаўне ў першы ж вечар сказала «мама», — узгадвае Насця. — Трэба было нешта спытаць, а я ніяк не магла да яе звярнуцца, саромелася. Але сказала «мама», так яно і пайшло».

Браты і сёстры таксама адразу прынялі Насцю. А хутка ў сям'і даведаліся пра мастацкі талент Насці: прасілі намаляваць то адно, то другое...

## КАЛЯРОВАЕ ЖЫЦЦЁ

Дагэтуль Насця Чорная не забылася, якога колеру ленты і з якім малюнкам туфлі купілі ёй да 1-га верасня ў школе аграгарадка Занарач. Яна ж упершыню ў жыцці выбірала адзенне і абутак. Раней як было? Прыйшоў да кастэлянкі — атрымаў. А тут цэлая прыгода, любой дзяўчыны спадабаецца. Яны ўсе, хлопчыкі і дзяўчынкі з вядомага на Мядзельшчыне, ды і на ўсёй Міншчыне, дзіцячага дома, прыходзіці ў школу акуратнымі, сабранымі. Маці прывучала. «Дзякуй табе мамачка, і за гэта, і за тое, што да нашай вучобы так адказна ставілася», — кажа Насця. Школу, дарэчы, дзяўчына скончыла з сярэднім балам 9,4. А яе маці цяпер збірацца атрымліваць педагагічную адукацыю, хаця, здаецца, яна — педагог ад Бога, інакш як бы на ўсіх цярпення, спагады, дабрыні і строгасці (у меру, але куды без яе?) хапіла б?

А дзеці стараліся не падводзіць маці, нездарма адзін сёння вучыцца ў педагагічным універсітэце, другі — у радыётэхнічным каледжы. Так і Насця старалася — калі вучылася ў школе, калі ўдзельнічала ў конкурсе «Сувеквецце талентаў», калі ездзіла на семінар «Юныя дараванні», калі ў выпускным класе ўдзельнічала ў Беларускай рэспубліканскай асамблеі лідарскага руху. Спачатку разам з настаўніцай Валянцінай Антонаўнай Роліч перамагла ў раёне, потым — у вобласці, адзіная прадстаўляла Міншчыну на ўзроўні рэспублікі. Прызнаецца: «Было прыемна адчуваць, што ты сярод лепшых». Прыемна не толькі таму, што яна, Насця, выйшла ў фінал, але і таму, што гэта будзе прыемна маці. Бо кожная перамога, кожны крок на жыццёвым шляху — для яе і дзякуючы ёй.

Хаця Насця, як і ўсе падлеткі, паказвала бацькам характар. Размалёўвалася пад «эма», у школу ў такім выглядзе прыходзіла. Курыць з сяброўкамі спрабавала. Маці за адзін вечар ад гэтага адвучыла. І без усякіх трагедый, без істэрык спакойна і стрымана. Несумненна, што ў Жанны Кавальскай сапраўды педагагічны талент.

Добрым словам Насця ўзгадвае і Беларускі дзіцячы фонд: у Занарачы работнікі яго рэгіянальных аддзяленняў не раз бывалі і бываюць, прывозяць падарункі, летась дзякуючы іх падтрымцы Насця пабывала на генеральнай рэпетыцыі дзіцячага «Еўрабачання» ў Мінску. І з паездкай у Маскву ёй дапамаглі. Насця і цяпер успаміная вандроўку з захапленнем: вялізны заапарк, дэльфінарый, Траццякоўская галерэя. Асабліва, як мне падалося, уразіла Насцю галерэя. Яна ж сама збіралася паступаць у Акадэмію мастацтваў у Мінску, але пабаялася. Разам з маці выбралі факультэт філасофіі і сацыяльных навук БДУ, аддзяленне псіхалогіі.

— Як здала першую сесію? — пытаюся ў Насці.

— Нядрэнна. Вучыцца пакуль цяжка, але вельмі цікава!

Што ж, крыху ўжо ведаючы Насцю, упэўнена, што яна і ў вучобе не падвядзе, і ў грамадскім жыцці не на апошніх ролях будзе. Характар у дзяўчыны не той, ды і маці нельга падводзіць. А крыху пазней, праз год, Насця збіраецца пайсці на дызайнерскія курсы. Пакуль жа з дазволу кіраўніцтва размалявала сцены ў блоку свайго інтэрната. Яна наогул шмат чаму збіраецца вучыцца. Ніякія веды ў жыцці лішнімі не бываюць, лічыць мая юная суразмоўца. «Мне ўжо васямнаццаць», — кажа яна. Я ўсміхаюся на гэта «ўжо» ў спалучэнні з лічбай «васямнаццаць», але потым задумваюся: можа, яна, Насця Чорная, і не памыляецца, бо ў яе жыцці ўжо шмат чаго было. Але яшчэ больш — наперадзе. Жыццё толькі пачынаецца, Насця!

**Марына ХІДДЖАЗ.**
**Фота аўтара**

## У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ



**Міністэрства прамысловасці заяўляе пра намеры стварыць 16 холдынгаў. Наколькі гэты працэс апраўданы і выгадны на гэтым этапе? Ці павысіць гэта канкурэнтаздольнасць дзяржпрадпрыемстваў? Гэтыя пытанні абмяркоўвалі ў Савеце Рэспублікі на спецыяльным семінары, прысвечаным стварэнню холдынгаў і іх ролі ў эканоміцы.**



**У Мінску нацыянальная кухня краін свету прадстаўлена шырока. А вось венесуэльскіх прысмакаў мы ўвогуле не ведаем. Шкада, бо крэольская кухня вартая калі не гурмана, дык хаця б чытача. Візітоўка крэольскай кухні называецца «венесуэльскі павільён». Чаму «венесуэльскі» — зразумела, а вось чаму «павільён»?**

# Гараскоп стрыжак на красавік



**4 красавіка.** Стрыжка ў гэты дзень спрыяльна адаб'ецца на вашым жыцці.

**5 красавіка.** У гэты дзень паход у цырульню не рэкамендуецца.

**6 красавіка.** Поўня. Стрыгчыся ў гэты дзень не рэкамендуецца. Выключэнне складае толькі кардынальная змена іміджу.

**7 красавіка.** Стрыжку пажадана адкласці на больш удалы дзень.

**8 красавіка.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі.

**9 красавіка.** Неспрыяльны дзень для стрыжкі.

**10 красавіка.** Можна смела звяртацца да цырульніка, бо стрыжка ў гэты дзень падаўжае жыццё.

**11 красавіка.** Стрыгчы валасы непажадана.

**12 красавіка.** Спрыяльны дзень для стрыжкі.

**13 красавіка.** Удалы дзень для стрыжкі валасоў.

**14 красавіка.** Стрыжка палепшыць ваш дабрабыт.

**15 красавіка.** Устрымайцеся сёння ад наведвання цырульні.

**16 красавіка.** Няўдалы дзень для стрыжкі валасоў.

**17 красавіка.** У выніку стрыжкі валасоў ці стварэння прычоскі вы прыцягнеце да сябе радасць і шчасце.

**18 красавіка.** Спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

**19 красавіка.** Стрыжка надасць вам прывабнасці, вы будзеце падабацца навакольным яшчэ больш.

**20 красавіка.** У выніку стрыжкі валасоў губляецца энергія чалавека. Як кажуць у народзе, «розум можна састрыгчы».

**21 красавіка.** Маладзік. Стрыжка валасоў строга забаронена.

**22 красавіка.** Стрыгчы валасы не рэкамендуецца, паколькі гэта можа пацягнуць спрэчкі з блізкімі людзьмі.

**23 красавіка.** Стрыжка валасоў не рэкамендуецца, паколькі гэта можа пацягнуць сур'ёзныя растраты ў будучыні.

**24 красавіка.** Стрыжка прынясе дыскамфорт і смутак.

**25 красавіка.** Стрыжка валасоў прынясе павелічэнне дабрабыту, вы можаце стаць крыху багацейшымі.

**26 красавіка.** Стрыгчы валасы непажадана.

**27 красавіка.** Стрыжка ў гэты дзень пацягне за сабой канфлікты.

**28 красавіка.** Стрыжка забяспечыць даўгалецце, добрае здароўе і зробіць ваша жыццё дастойным (калі не адразу, то ў бліжэйшыя месяцы).

**29 красавіка.** Стрыжка ў гэты дзень прыцягвае хваробы.

**30 красавіка.** Рэкамендуецца ўстрымацца ад стрыжкі.

**Падрыхтавала**
**Алена КРАВЕЦ.**

■ Факт

## ШКОДНЫЯ ВЕДЫ

**Афіцыйнае папярэджанне вынесена пракурорам Мазырскага раёна Гомельскай вобласці жыхару Мазыра — аб недапушчальнасці дзейнасці, звязанай з планаваннем, арганізацыяй і падрыхтоўкай да ажыццяўлення дзеянняў экстрэмісцкага і тэрарыстычнага характару.**

Як расказалі ў прэс-групе ўпраўлення КДБ па Гомельскай вобласці, студэнт адной з вышэйшых навучальных устаноў рэгіёна трапіў у поле зроку супрацоўнікаў органаў дзяржбяспекі як асоба, якая збірае інфармацыю аб спосабах вырабу выбуховых рэчываў і самаробных выбуховых прылад у хатніх умовах. Сам студэнт падчас праверкі растлумачыў, што ён сапраўды захапляецца хіміяй, асабліва працэсамі, якія адбываюцца пры гарэнні і выбуху. Атрыманую з розных крыніц інфармацыю назапашваў, аднак свае веды на практыцы не ўжываў. Грамадзяніну растлумачаны нормы заканадаўства Рэспублікі Беларусь, а таксама магчымасць прыцягнення яго да крымінальнай адказнасці пры парушэнні.

## ПАКУЛЬ ДЗІЦЯ ГЛЯДЗЕЛА МУЛЬЦІКІ

**Жыхарка Рэчыцы зазірнула да суседкі, якая жыла на тым жа паверсе — літаральна на пару хвілін. Гэтага часу хапіла, каб двухгадовая дачка замкнула за ёй дзверы.**

Трапіць у сваю кватэру жанчына ўжо не магла, а адчыніць дзверы ў дзіцяці сіл не хапіла. Давялося звяртацца па дапамогу да выратавальнікаў. Па аўталесках супрацоўнік МНС дабраўся да акна кухні на шостым паверсе і адчыніў дзверы знутры. Дзіця нават не зразумела, чаму так перапалохаліся дарослыя — дзяўчынка ўвесь час, пакуль яе выратоўвалі, спакойна ляжала на канапе і глядзела мультфільмы «Маша і мядзведзь».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**





**Предприятие изучает спрос на базу, включающую в себя:**
склады (1, 2), гараж на 3 л. автомобиля (3), открытую площадку (4), КПП (5) и АБК (6), расположенную по адресу: Гродненская обл., г.п. Зельва, как объект для сдачи в аренду. Возможна безвозмездная передача указанной базы (либо ее частей — I, II, III, IV) гос. предприятию.
**Тел. 8 (017) 293 42 19, 293 47 12.**
**www.oaobest.by**


Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Паляванне. Уша. Гар. Мухтар. Хала. Аніс. Фен. Алах. Трап. Асада. Біт. Топ. Шпак. Корань. Ада. Вар. Каюр. Сакі. Чака. Карабок. Каўказ. Дол. Сыта. Ніка. Квазар. Сват. Гало. Патон. Рама. Кракет.

**Па вертыкалі:** Узор. Павадыр. Асадак. Тэмп. Каракас. Грыф. Каўнас. Азу. Кіт. Хан. Юнак. Гара. Ятаган. Задатак. Алі. Ломе. Траса. Ікона. Клопат. Лато. Час. Расада. Хата. Абоз. Дон. Кола. Выратавальнік. Радыус.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.34 | 19.52 | 13.18 |
| Віцебск — | 6.22 | 19.43 | 13.21 |
| Магілёў — | 6.24 | 19.42 | 13.18 |
| Гомель — | 6.23 | 19.36 | 13.13 |
| Гродна — | 6.50 | 20.06 | 13.16 |
| Брэст — | 6.53 | 20.05 | 13.12 |

**Месяц**
*Поўня 6 красавіка.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

**Імяніны**
***Пр.*** *Васіля, Ісака.*
***К.*** *Антаніны, Антона, Бенядзікта, Вацлава, Ізыдара.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Прачнулася раніцай, ляжу, чакаю, калі мама сняданак прыгатуе, а потым успомніла, што мама — гэта я!**

На кухні адэскай камуналкі:
— Фіма, калі вы пагодзіцеся, каб я пасмажыла яечню на вашым сале, дык я дазволю вам зварыць ваша мяса ў маім супе.

**З нашай зарплатай мы павінны прыходзіць на працу, вітацца і сыходзіць!**

Прыходзіць хлопец у салон татуіровак. Яго пытаюцца:
— Што будзем біць?
— Мне танк на ўсю спіну!
Праходзіць 20 хвілін. Майстар:
— Гатова!
— Так хутка?
— А што тут — усяго чатыры літары!





**ЗВЯЗДА** БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.



НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 1487.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30
3 красавіка 2012 года.